№ 40 (639) 28 кастрычніка 2009 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**200 мільёнаў на кандыдата ў прэзідэнты**

Старонка 3



**Пакажы свой 3G!**

Старонка 15



**Сэкс: сіндром мэнэджэра**

Старонка 6


## У НУМАРЫ

**На авансцэну выйшла новая спецслужба Лукашэнкі**

У Мінску затрыманы намеснік начальніка аднаго з упраўленняў КДБ. Справу распрацоўвае Аператыўна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце — новая спецслужба Лукашэнкі. **Старонка 5.**

**Дактары ледзь не ўпяклі здаровага ў псіхбальніцу**

Чыгуначніку Андрэю Лапцеву памылкова прыпісалі дыягназ брата. **Старонка 6.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Новыя акцёры ў старых дэкарацыях

27 кастрычніка быў прэзентаваны Беларускі незалежніцкі блок, які стварылі пад выбары правыя арганізацыі.

Старт кааліцыі далі ва Ўправе БНФ, на Варвашэні, 8. У тым самым месцы, у той самай абстаноўцы амбіцыйна гаварылася пра стварэнне папярэдніх кааліцый, якія так і не дабіліся галоўнага — дэмантажу дыктатуры. Хто толькі ні сядзеў на гэтых крэслах за апошнія пятнаццаць гадоў. Акцёры мяняюцца, а правілы гульні застаюцца ранейшымі.

**Старонка 8.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Ляцелі ў казіно



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**а дамоў не вярнуцца. Каля аэрапорта «Мінск–2» разбіўся элітны самалёт, на якім расійскія бізнесоўцы ляцелі ў мінскае VIP–казіно «Шангры Ла».**

Лайнер кіраваўся з расійскага аэрапорта «Унукава» ў Нацыянальны аэрапорт «Мінск-2». У 21.14 дыспетчар мінскага аэрапорта выйшаў з ім на сувязь. Самалёт ішоў правей зададзенага курсу. Самалёт накіравалі на перапасадку. Ён зрабіў кола вакол аэрапорта і прыкладна на адлегласці двух кіламетраў ад узлётна-пасадачнай паласы пайшоў дакладна ў створ пасадачнай паласы.

Раптам кіламетры за два ад бетонкі паветранае судна пачало сыходзіць улева.

Дыспетчар паспрабаваў звязацца з ім, каб высветліць прычыны, аднак сувязь абарвалася.

Выратавальныя брыгады імгненна скіраваліся ў бок, дзе самалёт знік з экрану радараў. Знайшлі толькі абломкі. Апарат упаў кіламетры за два ад аэравакзалу, каля вёскі Пяцігодка. У густым лесе, не на хаты.

У элітным лайнеры мадэлі «Фалькон», які належаў авіякампаніі «С-эйр», ляцеў яе кіраўнік Марат Рамашкін, другі пасажыр Малышаў і тры члены экіпажу — пілот Самойлаў, штурман Снімшчыкаў і бортправадніца Латуціна.

**Працяг на старонцы 6.**

# Анамальны спад на рынку нерухомасці

**У верасні на другасным рынку жылля рэкордна ўпала лічба здзелак.**

За верасень і кастрычнік кошт квадратнага метра на другасным рынку жылля ў сталіцы вырас прыблізна на 1% і цяпер складае $1375. Першыя навіны пра хуткае падаражанне нерухомасці адразу замарудзілі продажы кватэр. Прадаўцы чакаюць вышэйшай цаны і не ідуць на саступкі.

Як вынік, колькасць здзелак па куплі-продажы кватэр змяншаецца. Верасень не апраўдаў спадзяванняў рыэлтараў. За месяц у краіне было зафіксавана 2229 угодаў. Гэта на 15% менш, чым у жніўні, і на 35% менш за леташні паказнік.

У абласцях купляюць кватэры ўвогуле ўдвая радзей, чым у 2008 годзе. Несуцяшальная статыстыка: на Брэстчыне продажы ўпалі з 393 здзелак у мінулым верасні да 209 у гэтым, на Гомельшчыне – з 435 да 226.

**ЯМ**

# Дзяды



Юлія Дарашкевіч

Дзяды — старажытнае беларускае свята памінання продкаў. Нездарма нават нацыянальнае адраджэнне ў канцы 1980-х пачалося менавіта з ушанавання Дзядоў.

У дахрысціянскія часы лічылася, што душы памерлых продкаў, якія прыходзяць на Дзяды, трэба пачаставаць. У ваколіцах вёсак палілі вогнішчы, каб вандроўныя душы не збіліся з дарогі.

На Дзяды было прынята гатаваць сем і болей (няцотны лік) святочных страў. Сеўшы за стол, клікалі продкаў: «Святыя Дзяды, ляціце сюды!»

І цяпер у канцы кастрычніка людзі едуць на могілкі, каб адведаць месца спачыну бацькоў і дзядоў.

**АП**

**Шэсце на Дзяды**

Традыцыйнае мемарыяльнае шэсце ў Нацыянальны некропаль Курапаты адбудзецца 1 лістапада.

Збор а 10:30 каля Мінскага гадзіннікавага завода (метро «Парк Чалюскінцаў»). Шэсце пройдзе маршрутам: праспект Назалежнасці — вул.Каліноўскага — Сядых — Карбышава — Гамарніка — Мірашнічэнкі. Яно дазволена гарвыканкамам.

# Грыбаўскайтэ адшыла Саннікава на канферэнцыі ў Рызе

У часе дыскусіі на міжнароднай канферэнцыі ў Рызе каардынатар беларускай грамадзянскай ініцыятывы «Хартыя-97» Андрэй Саннікаў заявіў, што Грыбаўскайтэ зняважыла беларусаў, запрасіўшы Лукашэнку ў Вільню. «Вы пагразлі ў геапалітыцы і забыліся пра каштоўнасці», — дакараў ён.

Грыбаўскайтэ адказала ў вельмі цвярдым тоне: «Калі вы хочаце працягу палітыкі, якая была безвыніковай 10 гадоў, гэта ваша права. А я лічу, што трэба даць шанец — не рэжыму, а беларускаму народу, на тое, каб далучыцца да Еўропы».

Прэзідэнт Эстоніі Томас Ільвэс дадаў: ён за бязвізавы рэжым з Беларуссю. Ён заўважыў, што сітуацыя з правамі чалавека ў Расіі нашмат горшая, чым у Беларусі, тым не менш з Расіяй ЕС дамаўляецца. «Беларусь — дыктатура, — дадаў Ільвэс, — але не апошняя дыктатура ў Еўропе».

Штогадовая канферэнцыя ў Рызе сёлета мела за назву «Аднаўленне эканомікі пры зменлівай сітуацыі з бяспекай: трансатлантычны парадак дня — 2010». Яна прайшла 23-24 кастрычніка. У ёй узялі ўдзел кіраўнікі трох балтыйскіх краінаў, міністры замежных справаў шэрагу еўрапейскіх дзяржаваў, высокапастаўленыя ўрадоўцы ЗША.

Незалежнае грамадства Беларусі ў Рызе рэпрэзентавалі, апрача Саннікава, дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Віталь Сіліцкі, заснавальнік сайта E-Belarus.org Міхал Дарашэвіч, былы пасол Беларусі ў Латвіі і палітвязень Міхал Марыніч, кіраўніца брусэльскага офіса «За дэмакратычную Беларусь» Вольга Стужынская.

**Мікола Бугай**

## СЦІСЛА

### «Мінскі форум» 4—6 лістапада

XII «Мінскі форум» пройдзе 4—6 лістапада ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры імя Яганэса Раў. У гэтым годзе яго тэма — «Беларусь і Усходняе партнёрства: перспектывы развіцця ў сферах палітыкі, эканомікі і грамадства». На форум з'едуцца ўрадоўцы, навукоўцы, дэпутаты з розных еўрапейскіх дзяржаваў.

Як плануецца, у адкрыцці форуму возьме ўдзел кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей. У час мінулага такога форуму ён паабяцаў вярнуць незалежныя газеты ў «Саюздрук». І абяцанне стрымаў. Ці стане сёлетні форум трыбунай для новых публічных заяваў?

### Суд пакінуў смяротнае пакаранне

Судовая калегія Вярхоўнага суда пад старшынствам Валерыя Калінковіча пацвердзіла прысуды, якія раней былі вынесены Мінскім абласным судом Андрэю Жуку, Івану Сарокіну і Уладзіміру Марозу. Яны прызнаныя вінаватымі: першыя два ў забойствах і У.Мароз за ўдзеле ў рабаўніцтве і разбоі. Такім чынам, смяротны прысуд Андрэю Жуку пацверджаны.

### Магутныя магнітныя буры

Магнітныя буры 28—31 кастрычніка могуць стаць аднымі з самых моцных і небяспечных за год. У часе магнітных бураў у людзей скача ціск, збіваецца сон. Асабліва трэба берагчыся людзям з парушэннямі сардэчнай дзейнасці.

**МБ; радыё «Свабода»; Звязда**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014

Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014

Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы па газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй падпісчыкам

Марыне З., А.С., Г.Я., І.Д., А.В., Ф.П., А.К., А.П., Мікалаю С., Т.П., В.Дз., В.Г., М.Х., Алене Г., Ірыне З., В.В., Марыі М., Анатолю К., Алене Л., Б.С., Юрыю М., І.Л., А.Б., Яўгену Ш., Уладзіміру Г., Святлане К., Уладзіміру Ч., Яўгену І., Уладзіславу Г., А.Дз., Я.А., Зінаідзе Б., М.А., А.П., Валянціне Ш., Тамары К., Валерыю Ш., Л.С., Наталлі Б., Ніне Ш., В.Б., Леаніду Г., Дз. Р., І.Л., Аляксандру С., А.Ш., Альберту С., Л.І., Юрыю Л., Мікалаю Ш., І.К., Ю.Я., А.М., Аляксандру К., А.Т., Вікенцію М., В.Ж., Алене М., Аляксандру М., Дз.Ш., М., І.Д., Аляксандру П., Віталію К., К.М., М.Б., В.Б., В.В., Святлане Р. з Мінска.

Моцна дзякуем за дапамогу НН чытачам з Каліфорніі (ЗША) **Кацярыне Вініцкай** і **Алесю Арцюховічу** і чытачу з Екацярынбурга (Расія) **Паўлу Падкарытаву**.

# 200 мільёнаў на кандыдата ў прэзідэнты

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына агучыла меркаваныя змены ў выбарчым заканадаўстве.

У першую чаргу ўлады абяцаюць гарантаванае ўваходжанне прадстаўнікоў палітычных партый і няўрадавых арганізацый у выбарчыя камісіі, а таксама абмежаваную колькасць чыноўнікаў у іх. Раней колькасць апазіцыянераў ва ўчастковых камісіях была на ўзроўні статыстычнай памылкі.

Будуць змены ў артыкуле аб правах назіральнікаў. «Мы прапануем уключыць у Выбарчы кодэкс норму аб тым, што назіральнік павінен сачыць за падлікам галасоў ва ўмовах, якія дазваляюць яму бачыць гэтую працэдуру», — паведаміла кіраўніца ЦВК.

Назіральнікі і цяпер бачаць, як лічаць бюлетэні. Не бачаць яны толькі, што на гэтых бюлетэнях напісана і пазначана. Нікога з назіральнікаў блізка да падліку не падпускаюць – глядзіце з адлегласці.

Пры датэрміновым галасаванні будзе прадугледжана магчымасць штодзённага складання пратакола аб колькасці грамадзян, якія атрымалі выбарчы бюлетэнь.

Апазіцыя настойвала на поўнай адмене датэрміновага галасавання. У Беларусі найбольшы ў Еўропе працэнт тых, хто галасуе датэрмінова. На апошніх парламенцкіх выбарах паказчык датэрміновага галасавання склаў 26% галасоў.

На думку прадстаўнікоў апазіцыі, асноўныя фальсіфікацыі робяцца акурат з бюлетэнямі тых, што прыйшлі на выбары раней адпаведнай даты.

Плануецца таксама істотна спрасціць парадак вылучэння кандыдатаў палітычнымі партыямі. Партыя зможа вылучаць сваіх кандыдатаў незалежна ад таго, ці ёсць у рэгіёне структура арганізацыі. Гэта насамрэч плюс для апазіцыі.

Запланаванае стварэнне ўласных грашовых фондаў кандыдатаў (свае зберажэнні, грошы спонсараў). Раней перадвыбарчую кампанію можна было весці толькі за сродкі, якія выдаткоўвала дзяржава.

Тым не менш, старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына ў нядзельным эфіры «Панарамы тыдня» зазначыла, што ў такіх фондах павінна быць зафіксаваная верхняя мяжа. Цяпер яна прапануецца ў памеры 3000 базавых велічынь, то бок 105 мільёнаў рублёў.

Таксама кандыдаты атрымаюць 2300 базавых велічынь ад дзяржавы. Разам сума не перавысіць 200 мільёнаў рублёў, ці 70 тысяч даляраў. Правесці за такія грошы паўнавартасную выбарчую кампанію проста немагчыма.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Апазіцыя не верыць у сумленнасць Ярмошынай.

Пакуль гэта толькі вусныя прапановы, якія павінны быць выкладзеныя ў законапраекце і прадстаўленыя на разгляд парламенту. Як тое будзе ў канчатковым выглядзе — пабачым ужо хутка. Ярмошына адзначала, што змены прадыктаваныя прапановамі АБСЕ і палітычных партый.

**Зміцер Панкавец**

## Анатоль Лябедзька: Маленькая, але перамога апазіцыі

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі каментуе магчымыя змены ў выбарчым заканадаўстве.

**«Наша Ніва»: Спадар Анатоль, як Вы ацэньваеце прапанаваныя змены?**

**Анатоль Лябедзька:** Хай і невялікай, але нашай перамогай. АГП зрабіла свой праект да выбараў, накіравалі ў Адміністрацыю прэзідэнта, БДІПЧ АБСЕ. Хоць мала хто верыў, што нешта можа змяніцца. Я не думаю, што новаўвядзенні нешта кардынальна зменяць.

**«НН»: А якія Вашы прапановы не прайшлі?**

**АЛ:** Ідэальным варыянтам была б адмена датэрміновага галасавання, якое стварае ўладам прэферэнцыю ў 20-30% галасоў. Хутчэй за ўсё, што на гэта ніхто не пойдзе. Увогуле ж, калі няма закона, то пра нешта гаварыць занадта рана. Тут шмат што будзе залежыць нават ад расстаўленых косак. Прывяду прыклад, што раней у выбарчай камісіі павінен быў быць адзін чыноўнік. Праўда, яшчэ адзін вылучаўся зборам подпісаў, а трэці — працоўным калектывам. Цяпер жа гаворыцца, што чыноўнікаў не павінна быць больш за трэціну. Дык гэта не зніжэнне, а павелічэнне іх колькасці! Пытанне накont прадстаўнікоў партый і арганізацый у выбарчых камісій таксама адкрытае. Хто сказаў, што гэта не могуць быць сябры БРСМ, Саюза ветэранаў, Сацыяльна-патрыятычнай партыі?

**«НН»: Чаму ўлады ўвогуле пайшлі на гэты працэс?**

**АЛ:** Уладам трэба прадаць як мага даражэй выбарчую кампанію. АБСЕ і іншыя арганізацыі ў выніковых дакладах напішуць, што мясцовыя выбары праходзілі з невялікімі недахопамі, але пазітыўныя змены відавочныя. Прэзідэнцкія выбары ўжо будуць успрымацца праз пэўную прызму дэмакратычных зменаў у краіне.



**«НН»: То бок Вы гаворыце пра адносную дэмакратычнасць толькі мясцовых выбараў?**

**АЛ:** Менавіта. Наконт прэзідэнцкіх выбараў у мяне няма ілюзій. Не выключаю, што ўлады створаць «аазісы дэмакратычнасці» на некаторых рэгіянальных участках вясной. Гэта дакладна не будзе Мінск, Гродна ці іншы горад з моцнай дэмакратычнай грамадой. Пакажуць, што апазіцыянеры могуць трапіць у мясцовыя Саветы. Глядзіце, усё было справядліва. Думаю, што прэзідэнцкія выбары будуць зноў узятыя пад жорсткі кантроль.

**Гутарыў ЗП**

## Калякін: Колькі можна апраўдвацца?

Пазачарговы з'езд Партыі камуністаў беларускай прыняў рашэнне аб пераймяненні арганізацыі. За назву Беларуская партыя аб'яднаных левых «Справядлівы свет» прагаласавала 89 з 158 дэлегатаў. Старшыня партыі Сяргей Калякін адказвае на пытанні «НН»:

**«НН»: Не шкада было развітвацца са старой назвай?**

**СК:** Шкада. Заўсёды цяжка развітвацца з часткай свайго жыцця, а ў камуністычнай партыі я ад 1975 года. Тым не менш, сённяшнія рэаліі дыктавалі нам такі крок.

**«НН»: Дык чым менавіта абумоўлена пераймянаванне?**

**СК:** Існуюць абсалютна розныя стаўленні да камуністычнай партыі. Колькі ўжо можна расказваць, што мы — не тыя камуністы, якія былі ва ўладзе ў СССР? Наша партыя была ўтвораная толькі ў 1991 годзе. Тым не менш, нам увесь час даводзілася апраўдвацца. Мы ведаем тыя плюсы і тыя мінусы, якія былі ў КПСС. Мы ніколі не заплюшчвалі вочы на адмоўнае ў камуністычным кіраванні ў нашай краіне. Змена назвы проста спрашчае камунікаванне з выбарцамі. Часта людзі згодныя з нашымі меркаваннямі, але калі чуюць, што гэта камуністы, то не хочуць мець нічога супольнага.

**«НН»: А чаму ў новай назве прысутнічае выраз «аб'яднаныя левыя»?**

**СК:** Да «Справядлівага свету» могуць далучыцца сябры незарэгістраваных левых



партый, яны самі заяўлялі аб такім намеры. Напрыклад, Партыі працоўных. Мы гэтага не хаваем.

**«НН»: З'езд праведзены, рашэнне аб змене назвы прынятае. Што цяпер?**

**СК:** Мэты засталіся тымі ж, што былі. Трэба больш актыўна працаваць з людзьмі, казаць ім праўду аб сітуацыі ў краіне. Выбары нам у гэтым сэнсе будуць спрыяць.

**«НН»: А са сваім удзелам у выбарах вызначыліся?**

**СК:** З асабістым — не. Вызначыліся, што будзе ўдзельнічаць кандыдат ад «Справядлівага свету». Хто ім стане, будзе вядома ў пачатку наступнага года.

**Гутарыў ЗП**

**Новая кампартыя**

Яе хоча стварыць колішні ідэолаг ПКБ прафесар з Брэста Іван Акінчыц. У знак пратэсту супраць перайменавання партыі ён выйшаў з яе шэрагаў яшчэ ў жніўні. Сярод сваіх хаўруснікаў сп.Акінчыц бачыць БСДП, але не АГП і БНФ. Таксама новая партыя перагледзіць стаўленне да Лукашэнкі. «У Калякіна звярыная нянавісць да Лукашэнкі. А мы будзем рэкамендаваць уладзе рабіць правільныя крокі», — кажа І.Акінчыц.

Як вядома, кампартый у Беларусі было дзве. Зараз можа нарадзіцца трэцяя.

## СЦІСЛА

### МЗС Беларусі «здзіўленае, калі не сказаць большага»

выказваннямі пасла Венгрыі ў Беларусі Ферэнца Контры аб сітуацыі ў краіне і ўспрымае іх «як уласнае меркаванне» дыпламата. Пасол заявіў, што адмена візавых санкцый Еўрасаюза ў дачыненні да беларускіх чыноўнікаў магчымая, калі захады Беларусі насустрач стануць пераканаўчымі. «На жаль, у нас склалася ўражанне, што словы і дзеянні беларускіх уладаў не заўсёды адпавядаюць адзін аднаму», — заявіў Ф.Контра.

### Байдэн «з надзеяй» глядзіць на Беларусь

Падчас выступу ў Варшаве, віцэ-прэзідэнт ЗША Джо Байдэн адзначыў, што Амерыка «з надзеяй глядзіць на магчымасці супрацоўніцтва ў справе пашырэння дэмакратыі ў рэгіёне, перадусім ва Украіне, Грузіі і Беларусі».

### «Малады Фронт» будзе ўдзельнічаць у мясцовых выбарах

24 кастрычніка Сойм «Маладога Фронту» аднагалосна прыняў рашэнне ўзяць актыўны ўдзел у мясцовых выбарах, якія павінны прайсці ў красавіку 2010 года.

**ЗП; БелаПАН**

# Мытны саюз: тры сабакі ў адной будцы

**Расія мае 57% галасоў у камісіі, якая будзе прымаць рашэнні па ўмовах Мытнага саюза.**

Саюз, які Беларусь, Расія і Казахстан збіраюцца стварыць у наступным годзе, карэнным чынам зменіць сітуацыю ў беларускай эканоміцы. Мытны кодэкс мае быць зацверджаны праз месяц — 27 лістапада — у Мінску. А 1 студзеня 2010 года запрацуе Мытны саюз. А ад 1 ліпеня на мяжы з Расіяй знікне апошні кантроль, і тавары змогуць свабодна перасоўвацца праз яе. Праз год, 1 ліпеня 2011 года, адкрыецца і расійска-казахская мяжа.

Запланаванае прыгожа выглядае на паперы, але цалкам давяраць не варта. Даўняя казка пра белага бычка і стварэнне міждзяржаўнага саюза Беларусі і Расіі гучыць да гэтага часу. Пастаянна заводзіцца і пласцінка адзінай валюты...

### Хто саступіць першым?

Нявырашаных пытанняў яшчэ шмат. Напрыклад, мыта на ўвоз аўтамабіляў у Беларусь меншае за расійскае. Для ўсходняй суседкі аўтамабільнае пытанне — прынцыповае, бо яна бароніць вытворцу сваіх «жыгулёнкаў». Або казахскае мыта, якое выплачваецца пры ўвязенні асабліва дарагіх тавараў, меншае за расійскае і беларускае ў пяць разоў. Ёсць у беларусаў прэтэнзіі і да занадта высокіх цэнаў на газ. Вырашыць праблему, на думку Міністэрства эканомікі Беларусі, проста — дастаткова прадаваць нашай краіне газ па расійскіх цэнах.

### Камбайнам — зялёнае святло

Калі паверыць, што ўсё запланаванае здзейсніцца, хто акажацца ў плюсе? Калі казаць пра эканоміку, то неадкладнага поспеху варта чакаць той частцы прадпрыемстваў, якія выпускаюць унікальную прадукцыю. Трактары і камбайны, якія Расія не хацела пускаць да сябе, лёгка праврвуцца праз усходнюю мяжу. Беларуская малочная прадукцыя, таннейшая і якаснейшая за расійскую, таксама знойдзе сабе новыя рынкі збыту. Уся сельская гаспадарка Беларусі, якая як мінімум да канца года будзе атрымліваць агромністыя дзяржаўныя датацыі, будзе глядзецца вельмі выгадна на фоне дзвюх іншых краін саюза.

Але галоўнае, у выйгрышы павінен застацца звычайны пакупнік. Перад ім з'явіцца яшчэ большы выбар тавараў па ніжэйшых цэнах. Аднак толькі тавараў, зробленых у межах трох краінаў. Мыта на імпартныя тавары будзе збірацца адзін раз. Пакуль што тавар, які ўвозіцца у Беларусь, напрыклад, праз Расію, абкладаецца падвойным мытам.



Мытны саюз — любімая ідэя Пуціна.

### Лёгкая прамысловасць можа прайграць

Далёка не ўсе прадпрыемствы будуць радыя адкрытым дзяржаўным межам. Насцярогу выклікае стан беларускай лёгкай прамысловасці. Малаімаверна, што яна будзе годна вытрымліваць канкурэнцыю з боку агромністага расійскага рынку.

Хапае і іншых момантаў, якія не дазволяць айчынным таварам канкураваць з таварамі суседзяў. Гэта і рознае падаткаабкладанне ў краінах, і розныя прынцыпы ўтварэння цэнаў, і ўжо згаданыя вышэй розныя кошты на энерганосьбіты. Ёсць і іншыя падводныя камяні, якія не дадаюць аптымізму беларускім эканамістам. Як расказаў у інтэрв'ю naviny.by эканаміст Вадзім Міцкевіч, які ўдзельнічаў у распрацоўцы адзінага мытнага кодэкса, «да траўня праект прыкладна супадаў з мытным кодэксам Еўрасаюза». Аднак у выніку атрымалася, што Расія мае 57% галасоў у камісіі Мытнага саюза, якая будзе прымаць рашэнні, абавязковыя для кожнай краіны. У Беларусі і Казахстана будзе ўсяго па 21,5% галасоў. Шмат што могуць вырашаць за нас.

І самае галоўнае, што ўдзелам у Мытным саюзе Беларусь усур'ёз адсякае сябе ад Еўрапейскага Саюза, прывязвае да Расіі.

**Ягор Марціновіч**

## МВФ задаволены палітыкай Лукашэнкі

**Міжнародны валютны фонд вылучыў Беларусі яшчэ 700 мільёнаў даляраў.**

МВФ завяршыў другі агляд выканання антыкрызіснай стабілізацыйнай праграмы ў Беларусі. Гэта аўтаматычна адчыніла Мінску доступ да крэдытнага траншу ў памеры прыкладна 699,5 млн даляраў. У выніку сума сродкаў, вылучаных Фондам для падтрымкі Беларусі ў рамках праграмы, дасягнула каля 2,23 млрд даляраў. Агулам жа ў рамках дадзенае праграмы Беларусь атрымае $3,63 млрд.

На 4-ы квартал года МВФ паставіў перад урадам задачу скарачіць колькасць ільготных крэдытаў, што вылучаюцца суб'ектам гаспадарання і грамадзянам. Таксама Фонд патрабуе ад урада паскорыць прыватызацыю дзяржаўных прадпрыемстваў.

**МБ**

## Пентхаўсы ў Мінску

**Пачалася заліўка падмуркаў першага беларускага хмарачоса «Ветразь».**

32-павярховы будынак узводзіцца на скрыжаванні вуліц Ціміразева, Максіма Танка і Кальварыйскай у сталіцы.

Вышыня будынку складзе 132 метры. У ім будзе 165 кватэр, а на верхніх паверхах размесцяцца элітныя двухузроўневыя пентхаўсы. Будаўніцтва жылога дома павінна скончыцца ў сярэдзіне 2011 года.

Падрыхтоўка будаўнічай пляцоўкі пачыналася яшчэ ў пачатку года. Пасля працы былі замарожаныя і толькі цяпер аднавіліся.

**ЯМ**



радыё свабода
Тэл. (017) 266 39 52
СМС 391 22 24
svaboda@rferl.org
п/с 111, Менск, 220005, Беларусь

ад 25 кастрычніка – новыя частоты, хвалі

| | | |
|---|---|---|
| 06:00–08:00 | 6105 кГц | 49 м |
| | 6120 кГц | 49 м |
| 18:00–20:00 | 7220 кГц | 41 м |
| | 9520 кГц | 31 м |
| 20:00–22:00 | 6150 кГц | 49 м |
| | 9865 кГц | 31 м |
| 22:00–24:00 | 5825 кГц | 49 м |
| | 7220 кГц | 41 м |

612 кГц 490 м сярэднія хвалі

www.svaboda.org

## СЦІСЛА

### Пенсіі падрастуць

З 1 лістапада пенсіі па ўзросту павялічваюцца ў сярэднім на 9,5%. У выніку сярэдняя пенсія па ўзросту ў лістападзе складзе 434600 рублёў і павялічыцца ў параўнанні з кастрычнікам на 37600 рублёў.

### Літва дачакаецца еўра

Міністр фінансаў Літвы Інгрыда Шыманітэ мяркуе, што еўра ў краіне можа быць уведзены пасля 2013 года. «Больш ранні тэрмін вымагаў бы непрапарцыйных высілкаў», — мяркуе міністр. Неабходная ўмова для ўвядзення еўра — зрабіць дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту меншым за 3% ВУП.

### Беларусь і Эстонія разам супраць «Нордстрым», Фінляндыя — за

Лукашэнка ставіцца крытычна да праекта пракладкі газапровада «Паўночны паток» па дне Балтыйскага мора. Ён лічыць, што газапровад павінен пайсці па сушы. Пра гэта заявіў міністр замежных справаў Эстоніі Урмас Паэт пасля перамоваў у Мінску.

Тым часам стала вядома, што следам за Даніяй Фінляндыя да канца 2010 года выдасць дазвол на будаўніцтва газавай трубы праз сваю акваторыю ў Балтыйскім моры.

### Талончык цяпер будзе каштаваць 700 рублёў

Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі прапаноўвае павысіць тарыфы на праезд пасажыраў у гарадскім грамадскім транспарце.

**МБ, ЯМ**

# На авансцэну выйшла новая спецслужба Лукашэнкі

У Мінску затрыманы намеснік начальніка аднаго з ключавых упраўленняў КДБ. Справу распрацоўвае Аператыўна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце — новая спецслужба Лукашэнкі.

Як стала вядома з вартых даверу крыніцаў, у Мінску затрыманы намеснік начальніка 3-га глаўка КДБ, аднаго з ключавых упраўленняў КДБ. Яго арыштавалі пры атрыманні хабару ад жонкі аднаго з абвінавачаных, які знаходзіцца ў СІЗА КДБ.

3-і глаўк КДБ — гэта аператыўны аддзел Камітэта. Арыштоўвалі чэкіста пры ўдзеле супрацоўнікаў МУС.

Як гэты аператыўнік КДБ убляпаўся ў справу аб хабары? Справа ў тым, што «амерыканка» — следчая турма КДБ — цяпер літаральна перапоўнена. Са сталінскіх часоў у ёй не было столькі падследных — камерсантаў, супрацоўнікаў спецслужбаў і іншых падазраваных.

Усё гэта спарадзіла спакусу ў некаторых супрацоўнікаў КДБ падзарабіць, аказваючы розную роду сумнеўныя паслугі зняволеным. Так, арыштаваны спецслужбіст прапаноўваў жонцы аднаго з затрыманых камерсантаў за 30 тысяч даляраў памяняць мужу арышт на падпіску аб нявыездзе. Жонка камерсанта напісала заяву ў Аператыўна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце, і справа закруцілася.

У КДБ гэтая гісторыя выклікала літаральна шок. Ад любых камер тароў Камітэт адмаўляецца.

Арышт высокапастаўленага супрацоўніка КДБ можа стаць першай гучнай справай Цэнтра, калі, як часта бывае ў Беларусі, за грахі начальнікаў не будуць расплачвацца падначаленыя.

**«Беларускі партызан»**

## Лукашэнку пагражалі фізічнай расправай

Сёлета на ягоны адрас прыйшло некалькі ананімных пагроз фізічнай расправы. Пра гэта паведамлялася ў дакументальным фільме Юрыя Гроерава пра Службу бяспекі прэзідэнта, які дэманстраваўся на БТ. Было адзначана, што супрацоўнікі службы бяспекі затрымалі «тэрарыста» проста калі ён укідваў у паштовую скрыню чарговы ліст.

Што сталася з гэтым грамадзянінам пазней, не паведамляецца.

**Зміцер Панкавец**

# Прадзюсэр Шульман у турме

Арыштаваны адзін з самых вядомых прадстаўнікоў беларускага шоу-бізнэсу. Ён сядзіць у сумнавядомым Жодзінскім СІЗА.

Паводле звестак «Ежедневника», Генадзь Шульман падазраецца ў здзяйсненні буйнога махлярства. Магчыма, справа ў вялікіх даўгах бізнэсмэна. Яшчэ ў маі 2007 г. Гаспадарчы суд Мінска прыняў рашэнне аб пачатку працэдуры банкруцтва прадзюсэрскай кампаніі «Клас-Клуб ДК», уладальнікам якой з'яўляўся Шульман. Прадпрыемства мела дзяржаўную ліцэнзію на гастрольна-канцэртную дзейнасць у Беларусі за №1. У дачыненні ААТ «Клас-Клуб ДК» адкрылі конкурсную вытворчасць, затым кіраўнік стаў збіраць фінансавыя прэтэнзіі шматлікіх крэдытораў.



Праблемы пачаліся, калі кампанія не змагла ліквідаваць пазыкі перад некаторымі сваімі партнёрамі, а таксама перад бюджэтам.

«Клас-Клуб ДК», якім кіраваў Генадзь Шульман, працавала з буйнымі замежнымі канцэртнымі агенцтвамі, «прабівала» ўключэнне Беларусі ў гастрольныя графікі сусветных зорак. Сярод тых, хто прыехаў у Беларусь, дзякуючы працы кампаніі, значацца Deep Purple, Scorpions, Nazareth, Роберт Плант, Патрысія Каас.

Канцэрт, падчас якога ў 1999 г. адбылася трагедыя на Нямізе, таксама ладзіла гэта кампанія.

Жонка Шульмана кажа, што «яго падставіў партнёр па бізнэсе».

**Вольга Жарнасек**




**Дзень памяці паўстанцаў адзначылі 25 кастрычніка на радзіме братоў Каліноўскіх. У апошнюю нядзелю кастрычніка людзі штогод з'язджаюцца ў райцэнтр Свіслач у Гродзенскай вобласці. Са Свіслачы калона машынаў кіруецца ў Якушоўку, на сядзібу Каліноўскіх. Малады гаспадар, што рассыпаў салетру на сваім гародзе, пабачыўшы сцяг, закрычаў здалёк: «Жыве Беларусь!»**

# Адукацыя будзе весціся толькі на дзяржаўных мовах

Намеснік міністра адукацыі укалоў польскую і літоўскую нацыянальныя меншасці.

Першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Жук заявіў, што «агульнае выкладанне ўсіх прадметаў у сістэме адукацыі Беларусі будзе весціся толькі на дзяржаўных мовах краіны, а выкладанне асобных прадметаў магчыма на мовах нацыянальных меншасцяў. Беларусь не будзе ствараць спецыяльных школ для нацыянальных меншасцяў. Выкладанне асобных прадметаў магчыма на нацыянальных мовах меншасцяў па рашэнні мясцовых органаў улады, у залежнасці ад сітуацыі ў тым ці іншым рэгіёне краіны». Яго цытуе агенцтва «Інтэрфакс».

Цяпер у Беларусі толькі дзве нацыянальныя меншасці маюць сярэднія школы са сваёй нацыянальнай мовай навучання — палякі і літоўцы.

Кіраўніца грамадскай польскай школы пры неафіцыйным Саюзе палякаў Беларусі Анжаліка Арэхва кажа: «Мы маем дзве польскія школы. Калі ў іх забароняць карыстацца польскай мовай падчас навучальнага працэсу, гэта будзе парушэннем заканадаўства. Нават калі проста не будуць дазваляць адкрываць новыя школы з недзяржаўнай мовай навучання — гэта таксама будзе парушэннем нашых канстытуцыйных правоў. Мы ў сваёй грамадскай школе цяпер маем 400 вучняў. У Гродне набралі тры класы першакласнікаў, у Ваўкавыску — два. Гэта першы раз такое. Раней было менш вучняў».

Захады па абмежаванні колькасці школ нацыянальных меншасцяў уваходзяць у супярэчнасць з Асноўным законам краіны. Паводле Канстытуцыі, «кожны мае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін. Дзяржава гарантуе ў адпаведнасці з законам свабоду выбару мовы выхавання і навучання» (артыкул 30).

Такая сітуацыя можа спыніць развіццё іх культуры. Магчымасць вучыцца на сваёй мове — найважнейшы элемент захавання нацыянальнай культуры ў асяродку, дзе пануе іншая культура.

На сёння асноўныя меншасці ў Беларусі — гэта расійцы, палякі на Гродзеншчыне, украінцы на Берасцейшчыне, яўрэі.

Забарона на адукацыю на роднай мове закране перш за ўсё беларускіх палякаў. Яны жывуць галоўным чынам у раёнах, якія прылягаюць да мяжы з Польшчай і Літвой. Праўда, на мінулым перапісе большая частка палякаў Беларусі назвала роднай мовай, а таксама мовай, ужыванай дома, беларускую.

**Алесь Пілецкі**

### Польшча патрабуе растлумачэння

Паводле першага сакратара дыпламатычнага прадстаўніцтва Польшчы ў Беларусі Паўла Марчука, амбасада звернецца да беларускіх улад, каб даведацца, што менавіта азначаюць словы А.Жука. «Мы не маем поўнага тэксту інтэрв'ю, фрагменты выказванняў вядомыя толькі паводле некаторых інфармацыйных агенцтваў. Хочам даведацца, што канкрэтна хацеў сказаць першы намеснік міністра адукацыі Беларусі», — зазначыў П.Марчук.

# КДБ супраць МУС: новы эпізод

Спецслужбісты вінавацяць міліцыянта ў незаконным атрыманні крэдытаў.

Камітэт дзяржбяспекі ўзбудзіў крымінальную справу ў дачыненні да маёра Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС.

Магілёўскае ўпраўленне КДБ ставіць яму ў віну махінацыі з атрыманнем крэдытаў у шэрагу банкаў Магілёва. Паводле звестак КДБ, падчас службы ў Магілёве маёр са снежня 2007 года па люты 2009 года ўносіў скажоную інфармацыю ў банкаўскія дакументы, а таксама выкарыстоўваў даведкі аб даходах з загадзя завышанай сярэднемесячнай сумай зарплаты. Дзякуючы гэтаму, супрацоўнік міліцыі атрымліваў значныя грашовыя крэдыты ў банках.

Зараз КДБ спрабуе высветліць, ці сам аператыўнік падрабляў даведкі аб даходах, ці яму дапамагалі супрацоўнікі бухгалтэрыі МУС.

**«Ежедневник»**

# Ляцелі ў казіно


ЮЛЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«Шангры Ла»**

Першае ў Мінску VIP–казіно. Мінімальная сума абмену грошай на фішкі там складае 5 тыс. даляраў.

Сумы мінімальных ставак: на рулетцы — 25 даляраў, у картачных гульнях — 200 даляраў. У раней адкрытых мінскіх казіно гэтыя сумы абмежаваныя: 1 і 5 даляраў адпаведна.

У адкрыццё казіно інвеставаў больш за $1 млн міжнародны холдынг Storm International. Стваральнікі не выключаюць варыянт чартэрных паездак гульцоў у «Шангры Ла» з Масквы і іншых сталіц былых саюзных рэспублік, дзе ёсць цяжкасці з гульнявым бізнэсам, але маюцца рэгулярныя авіязносіны з Мінскам.

**Ej.by**

**Самалёт ВАе-125**

разлічаны на восем пасажыраў. Ён распрацаваны для бізнэс–авіяцыі. Даўжыня фюзеляжа — 14,33 м, размах крылаў — 14,33 м, максімальная ўзлётная маса — 12,5 т. Максімальная хуткасць 805 км/г, экіпаж складаецца з двух чалавек.




**Працяг са старонкі 1.**

Для разбору прычын катастрофы створаная спецыяльная камісія з прадстаўнікоў Міждзяржаўнага авіяцыйнага камітэта СНД, Беларусі, Расіі. Магчыма, у склад камісіі ўвойдуць прадстаўнікі амерыканскай і брытанскай кампаній — вытворцаў самалёта.

Бізнэсоўцы ляцелі ў дарагое казіно «Шангры Ла», якое нядаўна адчынілася ў Мінску на вуліцы Кірава, побач са Штаб-кватэрай СНД.

Казіно пераехала ў сталіцу Беларусі з Расіі, пасля таго як расійскія ўлады пачалі згортваць крымінагенны гульнявы бізнэс.

Мінімальная сума абмену грошай на фішкі ў гэтым VIP-казіно складае 5 тыс. даляраў. Мінімальная стаўка ў рулетку — 25 даляраў, у картачных гульнях — 200 даляраў.

У звычайных мінскіх казіно гэтыя сумы абмежаваныя 1 і 5 далярамі адпаведна.

Дзіва што казіно «Шангры Ла» разлічана на заможных кліентаў з Расіі, якіх дастаўляюць у Мінск пагуляць чартэрнымі рэйсамі.

**Мікола Бугай**

# Сэкс: «сіндром мэнэджэра»

Сэксолаг Зміцер Капусцін расказвае пра асаблівасці полавага жыцця падчас эканамічнага (і іншага) крызісу.

«Да сэксолагаў часцей звяртаюцца мужчыны. Бо імітаваць эрэкцыю складаней, чым імітаваць аргазм жанчыне, — кажа лекар-сэксолаг Зміцер Капусцін.

Калі казаць пра сэксуальнае задавальненне, то праблем хапае і ў мужчын, і ў жанчын. Аднак жанчыны часцей за ўсё не прыходзяць. Жанчына можа пражыць усё жыццё без аргазму, калі яна арыентаваная на асобу мужчыны, на тое, каб даць яму радасць у жыцці. Яна не хлусіць, калі кажа, што «мне з табой добра».

Праблемы ў сэксуальнай сферы растуць з узростам: калі ў 20 гадоў каля 20% людзей маюць нагоду пайсці да сэксолага, то ў 40 гадоў — парадку 40%, у 60 гадоў — 60%.

Падчас фінансавага крызісу ў людзей стала болей праблемаў і перажыванняў, што не лепшым чынам адбіваецца і на сэксуальнай сферы жыцця. Інтэнсіўныя нервовыя і фізічныя нагрузкі выбіваюць з каляіны. Могуць нават прывесці да «сіндрома мэнэджэра»: «Усе памятаюць свае іспыты ў інстытуце ці школе. Скажыце, за 20 хвілінаў да экзамена вам да сэксу? Чалавек з «сіндромам мэнэджэра» ў такім стане панічнага стрэсу жыве 24 гадзіны апошнія некалькі гадоў. Яго лібіда зніжаецца.

Калі даць яму заспакаенне, адпусціць у адпачынак, адключыць тэлефоны, то ён зажыве сваім звычайным палавым жыццём. Потым вяртаецца на працу, літаральна два-тры дні, і зноўку жонка прыходзіць нам скардзіцца».

Параўнаць статыстыку, ці стала болей праблем у сэксуальным жыцці беларусаў да фінансавага крызісу і пасля яго, Зміцер Капусцін не рашыўся: «Усю статыстыку збіваюць прэпараты тыпу віягры. Існуе прыблізна 15 розных лекаў з падобнымі дзеяннямі, я іх усе ўмоўна называю «віяграй».

Я чуў, што ў Беларусі за восем месяцаў гэтага года было прададзена каля 65 кг такіх прэпаратаў — парадку 1 млн 300 таблетак. У тыдзень набываецца парадку 40 тыс. таблетак, і можна выказаць здагадку, што каля 20—30 тыс. мужчын сядзяць на віягры. А звяртаецца да лекара прыблізна 1,5 тысячы, гэта ў 20 разоў менш».

Капусцін лічыць прэпараты кшталту віягры эфектыўнымі. Аднак нельга забывацца на пабочныя эфекты. Прэпарат лепей набываць пасля размовы з лекарам, інакш ёсць рызыка нашкодзіць здароўю.

Фінансавы крызіс, стомленасць пасля працы ці жыццёвыя перажыванні не заўсёды з'яўляюцца прычынамі сэксуальных праблем. Бывае, што гэтыя чыннікі, — толькі «адмазка» ад сэксу.

«Усё залежыць ад матывацыі шлюбу, — кажа Капусцін. — Як прыклад, прыходзіць да мяне жанчына і кажа, што ёсць праблемы сэксуальнага і псіхалагічнага плану, жадае разводзіцца з мужам. Шэсць гадоў яны пражылі разам, 3 месяцы таму ажаніліся, яна ўжо на другім месяцы цяжарнасці. Запытваю яе, чаму збіраюцца развесціся: «Дык ён жа дэбіл!» Пытанне: а чым жа яна думала гэтыя шэсць гадоў?

Вастрыня адносін можа скончыцца прыблізна праз чатыры ці пяць гадоў. Апяненне каханнем праходзіць, хімічная рэакцыя канчаецца, і важна, наколькі гэты чалавек стаў блізкім і дарагім.

Таму кахаць трэба захлёбваючыся гэтулькі часу, колькі ў вас атрымаецца. Бываюць жа людзі, якія і па 30, і па 40 гадоў глядзяць адзін на аднаго як у першы раз».

**Настасся Шамрэй**

**Зміцер Капусцін**
лекар–сэксолаг. За 35–гадовую практыку прыняў каля 50 тысяч пацыентаў.

# Дактары ледзь не ўпяклі здаровага ў псіхбальніцу

Чыгуначніку Андрэю Лапцеву памылкова прыпісалі дыягназ брата.

У красавіку 2009 года работнік чыгункі Андрэй Лапцеў знаходзіўся на бальнічным. Калі падпісваў свой бальнічны ліст, у медыцынскай картцы заўважыў кантрольны талон выкліку хуткай дапамогі. У талоне былі пазначаны звесткі на Андрэя Лапцева за 2005 год з дыягназам «пасляэпілептычны стан», які паставілі медыкі хуткай дапамогі.

Андрэй быў абураны, бо не толькі не выклікаў хуткай у той час, але і жыў у іншым месцы, не з бацькамі. Аказалася, хуткая прыязджала да яго старэйшага брата Сяргея, інваліда другой групы: «Калі я запытаў у сваіх родных, ці быў выклік хуткай дапамогі ў 2005 годзе, то яны гэта пацвердзілі. Хуткую выклікалі майму старэйшаму брату, у якога сімптомы былі падобныя да эпілепсіі», — кажа Андрэй.

Магчыма, аператар хуткай дапамогі не запісаў своечасова ініцыялаў ягонага брата і пазней па адраснай кнізе выпадкова ўзяў ягоныя ініцыялы.

Каб даказаць, што ён не хворы на эпілепсію, Андрэй звяртаўся ў абласное ўпраўленне аховы здароўя. Там яму сказалі, што чыгуначная паліклініка ім не падведамасная і трэба звяртацца ў Мінск у Рэспубліканскі псіхіятрычны цэнтр. Паліклініка №5 па месцы жыхарства працоўнага не знайшла ніякіх дадзеных выкліку хуткай дапамогі.

«Мая чыгуначная паліклініка дала мне накіраванне ў Рэспубліканскі псіхіятрычны цэнтр у Мінску. Псіхіятр гэтага цэнтра Таццяна Дакукіна хацела мяне адправіць на праверку ў псіхушку. Я катэгарычна адмовіўся. У Міністэрстве аховы здароўя мне параілі звярнуцца да іншага спецыяліста ў Рэспубліканскі цэнтр неўралогіі і нейрахірургіі. Там мне адмовілі і нават далі даведку, што без першаснай медыцынскай дакументацыі па маім выпадку яны абследаванне рабіць не будуць», — адзначае Андрэй.

«Такая памылка, — распавядае Андрэй, — вядзе да таго, што я з гэтым дыягназам не здолею прайсці ні адну медкамісію. На працы ад гэтага не хацелі працягваць са мной кантракт. Прыйшлося ўгаворваць сваё начальства, каб яны саступілі».

Псіхіятр Марыя Рудакоўская адзначае, што паставіць дыягназ эпілепсія толькі па адным выпадку немагчыма.

## Як даказаць, што ты не эпілептык?

Дзеля гэтага патрэбна комплекснае абследаванне.

«Эпілепсія бывае двух відаў — ад нараджэння і здабытая на працягу жыцця. Устанавіць факт таго, быў прыпадак ці не — магчыма толькі, калі прыпадак адбываўся не так даўно. Калі ж гутарка ідзе пра тэрмін у тры гады, то гэта зрабіць немагчыма. Думаю, што энцэфалаграма галаўнога мозга нічога не пакажа», — кажа Марыя Рудакоўская.

Праваабаронца Барыс Бухель кажа, што ў Магілёве шмат нараканняў на працу хуткай дапамогі. «Дзеля таго, каб высветліць, хто вінаваты, павінна быць праведзенае службовае расследаванне. Мы з Андрэем прынялі рашэнне адстаяць ягоную праўду ў судзе», — адзначыў праваабаронца.

**Ігар Барысаў, Магілёў**

# Нацыянальны абсурд, або Настальгія па чужынскай уладзе

У 1939 годзе беларусы заплацілі крывавую цану, але як нацыя выйгралі. Піша **Сяргей Богдан**.

Каб стварыць сваю ідэалогію, нацыянальнаму руху патрэбныя гады, але па любых мерках беларускі нацыяналізм марудзіць з уласнай ацэнкай падзеяў восені 1939 года. Многія нацыянал-дэмакраты ўвогуле пераняслі польскую пазіцыю датычна падзеяў, звязаных з узʼяднаннем Заходняй і Усходняй Беларусі.

Вытокі праблемы відавочныя. За часамі БССР беларусаў вучылі дагмату аб абсалютнай пазітыўнасці 1939 года. Апаненты камуністычнага рэжыму пачалі дзейнічаць «ад адваротнага» — мяняючы палярнасць у камуністычных ацэнках гістарычных падзеяў.

Супрацьстаўляючы сябе СССР-Расіі, мы прагна чыталі яе апанентаў: перш за ўсё даступныя нам тэксты суседніх нацыяў. Між тым, многія падзеі інтэрпрэтаваліся ў іх з пазіцыі інтарэсаў іх нацый, не беларускай.

У аснове беларускага погляду на любыя падзеі мусіць ляжаць іх асэнсаванне з пункту гледжання здзяйснення нацыянальных мэтаў беларускага руху.

Недарэчнымі выглядаюць падкопы пад узʼяднанне двух частак Беларусі, што суправаджаюцца спасылкамі на парушэнне міжнароднага права Савецкім Саюзам пры далучэнні Заходняй Беларусі да БССР. Міжнароднае права наогул не прадугледжвала нацыянальнага адзінства для беларусаў — вось горкая ісціна, а міжнародны кантэкст амаль



заўсёды вымагае экстраардынарных захадаў дзеля ўзʼяднання падзеленых народаў ці дасягнення незалежнасці. На шляху бездзяржаўных народаў заўсёды стаяць нормы міжнароднага права. Яно дарма што завецца між-**народным**, на справе ёсць між-**дзяржаўным** і арыентаваным на ўжо існуючыя дзяржавы. Дамагчыся нацыянальнай незалежнасці ці абʼяднаць раздзелены межамі народ можна толькі насуперак існуючай сістэме.

Дзядоўскія ж успаміны пра «райскія» польскія часы нагадваюць настальгію па СССР ды агульную схільнасць асобаў старэйшага веку лічыць, што лепшае засталося ў мінулым. У рэальнасці Варшава захоўвала крэсы адсталым, аграрным краем.

Кароткачасовы росквіт беларускай грамадзянскай супольнасці ў Заходняй Беларусі 1920-х (Тарашкевіч, Станкевічы, Луцкевіч, беларускія гімназіі) супаў з узлётам мастацтваў (Сергіевіч, Драздовіч, Танк, Арсеннева, Аляхновіч). Аднак гэта быў толькі момант, які змяніўся адкрыта каланізатарскай палітыкай.

Аднак не трэба пераносіць на сённяшнюю дэмакратычную і плюралістычную Польшчу віну за шавіністычны рэжым II Рэчы Паспалітай і якімсьці чынам атаясамліваць іх. Гэта — дзве розныя краіны і дзяржавы.

Цяпер ужо няважныя матывы савецкага кіраўніцтва падчас увядзення войскаў у Заходнюю Беларусь і Украіну, важныя наступствы — сучасная Беларусь ад Гомеля да Гродна.

Часта кажуць, што тая БССР была, маўляў, «несапраўднай» дзяржавай беларускага народа. Але бясспрэчна: нягледзячы на велізарныя палітычныя праблемы ў БССР, у ёй было шмат

28—30 кастрычніка ў Беластоку прайшоў Народны сход Заходняй Беларусі, які легітымізаваў далучэнне Заходняй Беларусі да БССР і СССР.

кардынальных перавагаў у параўнанні з тым становішчам, у якім знаходзіліся беларускія землі пад Польшчай. У рамках СССР/БССР беларусы мелі асобную адміністрацыйную і гаспадарчую адзінку з этнічнай назвай «беларуская», дзе ўлада паступова перайшла да мясцовых элітаў.

У БССР быў таталітарызм, але існавала адукацыя па-беларуску. У Польшчы на 1939 год усе беларускія школы былі зачыненыя.

Беларусы страцілі свабоды і заплацілі крывавую цану сталінскаму рэжыму, апынуўшыся ў СССР, але як нацыя выйгралі. Нацыянальнае адзінства ёсць адной з мэтаў нацыянальнага руху, побач з дасягненнем незалежнасці ў рамках уласнай дзяржавы. Таму ў якой бы форме ні адбывалася ўзʼяднанне 1939 года, для беларусаў яно мела станоўчае значэнне.

Размовы, што абʼяднанне было «няправільным», — пустапарожнія. Інакшым абʼяднанне быць проста не магло ў варунках таго часу. Яно ж і наогул магло не адбыцца. Прыкладаў таму багата па свеце (Ірландыя, Азербайджан, Курдыстан).

Трагічная сутнасць палітыкі палягае ў тым, што яна здзяйсняе нашыя мары ў нечаканых і непрыемных нам формах. Абʼядноўвае беларускія землі крамлёўскі дыктатар, ваююць супраць польскага рэжыму камуністы, а першым прэзідэнтам незалежнай Беларусі становіцца Лукашэнка. Але гэта і ёсць палітыка як такая, і толькі яна мае значэнне для лёсу народаў. І наступствы яе ў канчатковым выніку важнейшыя за намеры.

*Маладзечна*

**Сяргей Богдан**

магістр палітычных навук. Сябар Інстытута палітычных даследаванняў «Палітычная сфера».

# Круцяльства працягваецца, або «Лібералізацыя выбарчага заканадаўства»

Паводле новага выбарчага заканадаўства, апазіцыйны кандыдат зможа вытраціць на кампанію не больш за 70 тыс. даляраў.

Цэнтрвыбаркам прапануе абмежаваць памер індывідуальных фондаў кандыдатаў у прэзідэнты — 3000 базавых велічыняў. На сёння гэта 105 мільёнаў рублёў або менш за 40 тыс. даляраў. У дадатак да індывідуальна сабраных фондаў кандыдаты атрымаюць 2300 базавых велічынь ад дзяржавы. Разам сума не перавысіць 200 мільёнаў рублёў. Такую норму ЦВК прапануе на зацвярджэнне палаты прадстаўнікоў.

Гэта адна з нормаў, якія падаюцца як вялікая саступка лукашэнкаўцаў незалежнаму грамадству і Захаду.

Такім чынам, апазіцыйны кандыдат зможа вытраціць на кампанію не больш за 70 тыс. даляраў.

Гэта мізэрная сума — усяго 20 рублёў на кожнага грамадзяніна Беларусі.

За такую суму кандыдат не зможа надрукаваць нават столькі ўлётак, каб яны трапілі ў кожную паштовую скрынку. Няма чаго і казаць пра тэлевізійную рэкламу. Зрэшты, у «дэмакратычнай Беларусі» тэлебачанне працуе на аднаго чалавека, дык каб і меў грошы, туды з альтэрнатыўнымі ідэямі не ўсунешся. Дазволеных Ярмошынай грошай забракне нават на арганізацыю агітацыйных аўтакараванаў — традыцыйных спосабаў палітычнай агітацыі ў дэмакратычных краінах, якія і ў Беларусі можна было б ажыццявіць.

Сам Аляксандр Лукашэнка на ўсіх мінулых выбарах распараджаўся сумамі нашмат большага парадку. Ён правеў багаты «Усебеларускі народны сход», арганізаваў дзесяткі агітканцэртаў «За Беларусь». Спецвыпуск «Советской Белоруссии» трапіў у кожную скрыню. Адзін нумар гэтай газеты каштуе ў 25 разоў болей, чым тыя 20 рублёў, якія Ярмошына дазволіць вытраціць апазіцыі. Бюджэт аднаго «ўсебеларускага народнага сходу» будзе большы, чым кошт усёй апазіцыйнай кампаніі.

Знайшло пацвярджэнне тое, у чым і так ніхто не сумняваўся. Новыя нормы задуманыя Лукашэнкам і прызначанай ім Ярмошынай такім чынам, каб ніяк не парушылася іхняя манаполія на ўладу, устаноўленая імі ў парушэнне Канстытуцыі.

Апазіцыя канечне павінна выкарыстоўваць выбарчую кампанію для палітычнай агітацыі. Але трэба рабіць гэта па ўласным сцэнары, а не падыгрываючы ў шоу, мэта якога — легітымізацыя самадзяржаўя.

**Барыс Тумар**

# Беларускамоўны перапісчык: Папрацаваўшы перапісчыкам, я заганарыўся сваім народам!

Напаткаў розных людзей. Некаторыя валодаюць англійскай мовай... і не ведаюць дзень народзінаў маці.

Але што мяне найбольш уразіла: з кожным днём перапісу ўсё больш адчуваў гонар за беларускую нацыю. Затурканыя, на выгляд абыякавыя людзі, нягледзячы на шматгадовыя пакуты ўласнае мовы, ведаючь сваю адметнасць — беларушчыну. На пытанне пра родную мову давалі адказ кшталту «Запишите белорусский. Может, хоть больше людей по-белорусски разговаривать будет».

Людзі смела, з гонарам называюць сябе беларусамі. Гэтая ціхая, але паўсюдная беларускасць — адно з вялікіх маіх адкрыццяў.

**Юльян Місюкевіч, студэнт БДУ, перапісчык па вул. Матусевіча, Мінск**

## ЦЫТАТЫ

### Лукашэнка: Наеўся ўладай, аж ванітуе

«Лукашэнка ўжо дастаткова на чале ўлады, наеўся ёю так, што ванітуе, і пытанне ў тым, дзеля чаго я стараюся яе захаваць».

**Аляксандр Лукашэнка на перамовах з міністрам замежных справаў Эстоніі Урмасам Паэтам.**

### Лукашэнка баіцца, што яго праслухоўваюць?

«Пошук ... прыстасаванняў для несанкцыянаванага зʼёму інфармацыі зʼяўляецца надзвычай важнай задачай, якая патрабуе пастаяннага ўдасканалення ведаў і навыкаў супрацоўнікаў усіх падраздзяленняў», — сказаў А.Лукашэнка на ганаровым сходзе да 15-годдзя Службы бяспекі прэзідэнта, перадае «Інтэрфакс».

# Неперакладальны БНБ

**27 кастрычніка прайшла прэзентацыя Беларускага незалежніцкага блоку.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Пра стварэнне нацыянальнай кааліцыі гаварылі даўно. Але жаданне стварыць шырокі фронт за перамены, на ўзор таго, які перамог у Чылі Пінача-та, а ў Славаччыне — Мечыяра, афармленне такога альянсу стрымліваў.

У выніку ў складзе Аб'яднаных дэмакратычных сілаў бээнэфаўцы спрачаліся з камуністамі, Мілінкевіч — за ўплыў з Лябедзькам і г.д.

Змена пакаленняў у Партыі БНФ прыспешыла перагрупаванне сілаў. Ядром новага блоку сталі Рух «За Свабоду», Партыя БНФ і Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Далучыліся таксама меншыя арганізацыі — «Малады фронт», «Маладая Беларусь», «Правы альянс», Рух «Разам», МХСС «Маладыя дэмакраты».

Падчас перамоваў было прынятае рашэнне, што назвай новага ўтварэння стане «Беларускі незалежніцкі блок». Прэзентацыя кааліцыі праходзіла 27 кастрычніка на Варвашэні, 8.

Журналістаў і проста цікаўных прыйшло больш за паўсотні. Апошні раз столькі збіралася на Управе хіба што пасля вызвалення Аляксандра Казуліна.

Першымі месца ў прэзідыуме занялі Аляксандр Мілінкевіч і Зміцер Дашкевіч. Нехта з журналістаў на гэта зазначыў: «Вас толькі двое села, а месца ўжо амаль няма. Куды астатніх пасадзіце?» «У Адміністрацыі прэзідэнта месца болей... І мэбля лепшая», — імгненна адрэагаваў другі.

Час прыйшоў, а мерапрыемства ніяк не пачыналася. «Віталь, ну ідзі ты ўжо», — рэзка гукнуў Рымашэўскага Дашкевіч. Сустаршыня БХД ж у гэты час мірна сёрбаў гарбату і не глядзеў на гадзіннік. Звярнула ўвагу, што хадэкаў прадстаўляў менавіта Рымашэўскі, а не Севярынец. Павел сціпла ўсеўся ў зале.

Лідэр БНФ Аляксей Янукевіч спазняўся, толькі прыехаў з хаты на прэзентацыю, бо грыпуе. Месца заставалася толькі з самага краю стала. Заставацца на правах беднага сваяка Янукевіч не захацеў — пасунуў у кут Вячаслава Сіўчыка, а сам усеўся амаль у цэнтр.

І вось ён, момант падпісання. Першым дэкларацыю аб стварэнні Беларускага незалежніцкага блока падпісвае лідэр «Маладой Беларусі» Артур Фінькевіч.

Потым дакумент ідзе па коле, пакуль на ім не з'яўляецца восем аўтографаў. Выніковы дакумент у рукі бярэ Віталь Рымашэўскі, пазуючы перад фотакарэспандэнтамі.

«Гэта гістарычная падзея. Аб'ядналіся тыя сілы, якія стаяць на грунце незалежнасці. Назва сведчыць, што мы аб'ядноўваемся не на кароткі тэрмін», — кажа Аляксей Янукевіч.

Аляксандр Мілінкевіч, які ніяк не спрабаваў вылучыцца з падпісантаў (нават слова ўзяў трэцім), нагадаў, што блок таксама і праеўрапейскі. «Для нас важны выбар для Беларусі. Мы хочам, каб адбылася еўрапеізацыя краіны. Колькасць людзей, якія хочуць больш шчыльных стасункаў з Еўропай, увесь час расце. Расія — наш сусед, партнёр, але гэта не значыць, што мы павінны будаваць адзін дом на дваіх», — сказаў лідэр Руху «За Свабоду».

Журналіст расійскага «Камерсанта» адразу пацікавіўся, ці збіраецца Мілінкевіч удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах, намякаючы, што кааліцыя створаная акурат пад яго.

«Я гатовы быць кандыдатам ад гэтага блока, гэта сур'ёзная сіла, але рашэнне аб вылучэнні яшчэ не прынята. Я б не пераболышваў бы тыя змены, што рыхтуюцца ў выбарчае заканадаўства, але байкатаваць выбары нельга», — зазначыў А.Мілінкевіч.

— Хто яшчэ можа далучыцца да БНБ?

— Вядуцца перамовы з партыямі Шушкевіча і Навасяда, адмовілася толькі АГП вуснамі Анатоля Лябедзькі, — быў адказ.

— Якія акцыі, мерапрыемствы рыхтуеце?

— Першым мерапрыемствам блока будзе Беларускі еўрапейскі форум 14 лістапада.

— Ці азначае стварэнне БНБ смерць для АДС?

— Мы хрысціяне, таму нікога забіваць не збіраемся, — адказаў Рымашэўскі.

**БНБ у дзень сваёй прэзентацыі вывесіў 100 сцягоў**

Бел–чырвона–белыя сцягі з'явіліся 27 кастрычніка ва ўсіх абласных цэнтрах. Апроч таго, сцягі залуналі ў Рэчыцы, Нясвіжы, Салігорску, Баранавічах, Лідзе ды іншых гарадах.

Гэтая акцыя была прымеркаваная да прэзентацыі Беларускага незалежніцкага блока. Яе зладзілі актывісты Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі.

Пытанняў аказалася няшмат. Прэзентацыя заняла не больш за паўгадзіны. Пасля гэтага журналісты расійскіх выданняў доўга спрачаліся, як перакласці назву кааліцыі. Сышліся на тым, што яна будзе неперакладальнай. Накшталт лейбарыстаў, «Руху» ці «Бацькіўшчыны». Чыста беларуская рэалія.

**Зміцер Панкавец**

# Як абіраўся брэнд?

**Назва «Беларускі незалежніцкі блок» атрымала неадназначную рэакцыю ў інтэрнэце.**

«Незалежнасці ўжо нічога не пагражае! А як гэта перакладаецца на расійскую?» — пісалі на форумах. Як абіралася назва, расказвае лідэр Партыі БНФ Аляксей Янукевіч.

«Вялікая колькасць варыянтаў абмяркоўвалася. Сярод магчымых гучалі і Нацыянальна-дэмакратычная кааліцыя, і Народная кааліцыя, і Незалежніцкая платформа. Большасць варыянтаў круцілася вакол словаў нацыянальны і народны. Асобнай групай ішлі назвы, якія, на першы погляд, не ўтрымлівалі ніякага пазіцыянавання — «Новая Беларусь», «За Беларусь», «Наперад, Беларусь!».

Не хацеў бы казаць, хто якія варыянты прапаноўваў, каб пазней не было спекуляцый, чый варыянт лепшы. У выніку дыскусіі мы пагадзіліся, што сама назва павінна казаць, што за сіла ўтвараецца. Таму адразу адпалі варыянты кшталту «Новай Беларусі», тым больш такая назва ўжо існавала на пачатку 1990-х.

Былі спрэчкі, як гэта назваць — кааліцыя, блок, саюз, платформа? Кааліцыя хіба ўжо троху зацяганае слова. Блок гучыць больш дынамічна, сучасна і, як мне, лепш паказвае сутнасць новага ўтварэння.

Што тычыцца слова «нацыянальны», то ў большасці еўрапейскіх краінаў так называюцца нейкія шавіністычныя ўтварэнні.

На слове «незалежніцкі» сышліся, таму што яно яскрава пазіцыянуе тыя сілы, якія ўтвараюць гэты блок. І тое, што слова такое ўнікальнае беларускае, якое не перакладаецца наўпрост на іншыя мовы, таксама было ўспрынята добра».

**Запісаў ЗП**

АПЫТАННЕ «НН»

# «Ну, яшчэ да выбараў далёка, трэба дажыць»

**Беларусы застаюцца ў апатыі, пакуль не гатовыя размаўляць пра палітыку.**

Прэзідэнцкія выбары не за гарамі, а жыхары краіны пра гэта ні сном, ні духам. На вуліцах беларускай сталіцы мы запыталі людзей пра іх стаўленне да таго, што Аляксандр Мілінкевіч збіраецца балатавацца на пасаду прэзідэнта ў лютым 2011 года.

Звычайныя гаварлівыя беларусы давалі кароткія адказы. Асноўная частка людзей паціскала плячыма і казала нешта накшталт «Ну і няхай сабе».

**Мужчына гадоў 35-ці:**

«Ну, на здароўе, буду рады, калі нешта ўдасца».

**Мужчына старэйшых гадоў:**

«Я без паняцця».

**Жанчына 45-ці гадоў:**

«Ну, яшчэ да выбараў далёка, трэба дажыць».

**Студэнтка:**

«Вельмі добра. Я нават адкажу на беларускай мове. Поспехаў яму».

**Пенсіянерка:**

«Мілінкевіч? У мінулы раз штосьці ён мне не вельмі спадабаўся»

**Супрацоўніца ЖЭСа:**

«Я наогул лічу, што нам апазіцыя непатрэбная. Мне вельмі падабаецца наш прэзідэнт. Я ўдзячная, што няма вайны і тэрарызму».

**Служачы:**

«Ніяк наогул, абсалютна спакойна».

Людзі хуценька адказвалі і спяшаліся сысці. Далёка не ўсім падабалася размаўляць з журналістамі незалежнай газеты на «забароненыя тэмы». Міне крыху больш за год, і гэтыя ж людзі пойдуць на выбарчыя ўчасткі, каб абраць прэзідэнта сваёй краіны. Склалася ўражанне, што беларускія грамадзяне ўжо забыліся на тое, што маюць выбар.

**Вольга Жарнасек, Таццяна Гаўрыльчык**

# Ад КРАПП да АДС

У дэмакратычных краінах палітычныя арганізацыі і суполкі грамадзянаў яднаюцца ў большыя партыі і блокі, таму што інакш немагчыма перамагаць на выбарах. У сітуацыі аўтарытарызму прыз адсутнічае, таму і альтэрнатыўныя палітычныя сілы драбяцца. У паўпадполлі дробныя групы выжываюць лепш. У лукашэнкаўскай Беларусі апазіцыя ядналася, каб лепей выкарыстаць выбары для расхістання рэжыму, і разыходзілася зноў, калі выбары скончаліся.

### Каардынацыйная рада апазіцыйных палітычных партый

Першы крок да аб'яднання дэмакратычных сіл быў зроблены ў 1998 годзе, калі ўтварылася Каардынацыйная рада апазіцыйных палітычных партый. У яе склад тады ўваходзілі не толькі Партыя БНФ і Аб'яднаная грамадзянская партыя, але і ЛДП Сяргея Гайдукевіча, КХП-БНФ.

Менавіта КРАПП была суб'ектам перамоўнага працэсу паміж уладамі і апазіцыяй, якую ініцыяваў тагачасны кіраўнік мінскага офіса АБСЕ Ганс-Георг Вік.

У час парламенцкай выбарчай кампаніі частка суб'ектаў вырашыла байкатаваць выбары, а частка ўзяла ў іх удзел. Аднак ніводны прадстаўнік КРАПП у палату прадстаўнікоў абраны не быў. КРАПП праіснавала да 2002 года.

### Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў

Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў (КРДС) была ўтвораная ў 1999 годзе шасцю партыямі і арганізацыямі ўжо як сталая кааліцыйная арганізацыя беларускай апазіцыі. КРДС заснавалі АГП, БНФ, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная грамада), Асамблея дэмакратычных няўрадавых арганізацый, Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў і грамадзянская ініцыятыва «Хартыя'97». Пазней да КРДС далучаліся іншыя палітычныя суб'екты. Фактычна кааліцыя спыніла існаванне пасля прэзідэнцкіх выбараў 2001 года. Тады большасць суб'ектаў КРДС падтрымлівала кандыдатуру Сямёна Домаша.

### «Пяцёрка+»

У перыяд ад 2002 да 2004 гг. вялікай кааліцыі апазіцыі не існавала. Затое былі — канфедэрацыя «За сацыяльныя перамены» (сацыял-дэмакраты, Партыя працы і камуністы), кааліцыя «За незалежнасць» (БНФ разам з другой часткай сацыял-дэмакратаў). КРДС фактычна таксама існавала, але яе праца была паралізаваная.

На гэтым фоне ў студзені 2004 года ўтварылася Народная кааліцыя «Пяцёрка+». Яе сфармавалі Партыя БНФ, АГП, ПКБ, БСДГ і Партыя працы. Падтрымлівалі кааліцыю дэпутаты палаты прадстаўнікоў з групы «Рэспубліка». Была распрацаваная праграма кааліцыі «Пяць крокаў да лепшага жыцця».

### Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы

У лістападзе 2004 года ў Вільні прадстаўнікамі Еўрапейскай кааліцыі (Мікола Статкевіч, «Хартыя-97») і Народнай кааліцыі «Пяцёрка+» была падпісана пагадненне аб утварэнні Аб'яднаных дэмакратычных сіл Беларусі (АДС).

АДС падтрымлівала на выбарах 2006 года Аляксандра Мілінкевіча. Намаганнямі АДС былі напісаныя «Малая Канстытуцыя», «Эканамічная платформа» і «Стратэгія дэмакратычных сіл Беларусі».

У 2008 годзе з АДС выйшлі «Малады фронт», «Еўрапейская кааліцыя». Прэзідыум АДС не збіраўся ўжо больш за год.

ЗП

# Гісторыя кааліцыйнага будаўніцтва ў Беларусі

ад старажытнасці да XXI стагоддзя.

Гісторыя Беларусі ведае дастаткова прыкладаў, калі грамадскія і палітычныя сілы імкнуліся аб'яднацца для дасягнення сваіх мэтаў. Гэта не адразу была незалежнасць — да патрабавання ўласнай дзяржавы беларускія эліты прайшлі доўгі шлях, на якім хапала і аб'яднанняў, і рознагалосся.

### Беларускі нацыянальны камітэт

БНК быў створаны ў ліпені 1917 г. і ўвайшоў у гісторыю як першае аб'яднанне беларускіх палітычных сіл. Паўстаў у выніку рашэння З'езда беларускіх нацыянальных арганізацый. Мэтай стварэння БНК была выпрацоўка асноў аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай Федэрацыі. Як прадстаўнічы орган беларускага народа, меў права праводзіць перамовы з Часовым Урадам у Пецярбургу.

Беларускі нацыянальны камітэт у асноўным складаўся з сяброў Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Вагу ў Камітэце мелі і буйныя землеўласнікі — Раман Скірмунт, Магдалена Радзівіл, Даніла Друцкі-Любецкі. Рознагалоссі паміж сацыялістамі (Антон і Іван Луцкевічы, Вацлаў Іваноўскі, Алаіза Пашкевіч) і землеўласнікамі прывялі да расколу. БСГ дамагалася, каб БНК адстойваў правы сялян.

### Цэнтральная рада беларускіх арганізацый

На змену БНК адразу прыйшла новая кааліцыя — Цэнтральная рада беларускіх арганізацый. ЦРБА імкнулася аб'яднаць усе нацыянальна-дэмакратычныя сілы. Пад тэрмінам «дэмакратычны» ў тыя часы разумелі левыя сацыялістычныя арганізацыі. Таму дамінуючае становішча ў ЦРБА займалі прадстаўнікі БСГ. У кіраўніцтва Рады былі ўключаны Уладзіслаў Галубок, Язэп Лёсік, Аркадзь Смоліч. Апошні і быў фактычным кіраўніком кааліцыі.

ЦРБА яшчэ не выступала за незалежнасць Беларусі. Колькасць удзельнікаў арганізацый, што ўваходзілі ў ЦРБА, дасягала восенню 1917 г. 27 тысяч чалавек. У кастрычніку 1917 г. з мэтай паляпшэння працы Рада была рэарганізаваная ў Вялікую беларускую раду.

### Вялікая беларуская рада

ВБР адразу ж заявіла, што з'яўляецца беларускай краёвай уладай. У выканкам новай кааліцыі ўвайшлі Вацлаў Адамовіч, Аляксандр Прушынскі, Аркадзь Смоліч, Аркадзь Сакалоўскі — усяго 24 чалавекі. Найбольш рашучыя пачалі заклікаць да стварэння незалежнай дзяржавы.

У канцы лістапада 1917 г. ВБР звярнулася да народа з адозвай, якая змяшчала праграму дзеяннаў кааліцыі — абвяшчэнне дэмакратычнай беларускай рэспублікі і перадача ўлады ў ёй ВБР.

Першы Ўсебеларускі з'езд, ініцыяваны ВБР 7—18 снежня 1917 г., быў разагнаны бальшавікамі. ВБР працавала падпольна аж да абвяшчэння незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі.

### Таварыства беларускай школы

Новая патрэба кааліцыйнага будаўніцтва з'явілася ў 1920-я ў Заходняй Беларусі. Там розныя палітычныя сілы прыходзіліся яднаць для абароны агульнанацыянальных інтарэсаў перад палякамі.

У адрозненне ад Кампартыі, Грамады і пасольскага клуба «Змаганне», Таварыства беларускай школы не мела адкрыта палітычных мэтаў. Яго дзейнасць была скіраваная на павышэнне ўзроўню нацыянальнай свядомасці беларусаў, а значыць, і на стварэнне беларускай нацыі. ТБШ быў тым асяродкам, дзе аб'ядноўваліся інтарэсы камуністаў, сацыялістаў і хрысціянскіх дэмакратаў.

Кіраўнікамі і актыўнымі дзеячамі ТБШ былі Браніслаў Тарашкевіч, Радаслаў Астроўскі, Антон Луцкевіч, Адам Станкевіч.

Пасля разгрому БСРГ шмат яе сяброў пачалі актыўна дзейнічаць у таварыстве. У выніку кіраўніцтва ТБШ стала перад выбарам — засяродзіцца на асветніцкай працы альбо змагацца і за палітычныя правы беларусаў. Перамаглі прыхільнікі палітызацыі (у асноўным — прадстаўнікі КПЗБ), а з таварыства былі выключаныя іх праціўнікі — Р.Астроўскі, А.Луцкевіч.

Польскія ўлады забаранілі дзейнасць ТБШ у снежні 1936-га.

### Народны Фронт

Пасля доўгай савецкай забароны ў канцы 1980-х у Беларусі з'яўляецца незалежны грамадскі рух пад назвай Беларускі Народны Фронт. У БНФ не ўваходзілі нейкія палітычныя партыі — іх тады не існавала. Гэта была кааліцыя грамадзянскіх ініцыятываў. Менавіта БНФ стаў сілай, якая каталізавала здабыццё незалежнасці. У 1993 г. БНФ стаў палітычнай партыяй, пасля паразы на прэзідэнцкіх выбарах Зянона Пазняка, кандыдата ад БНФ, значэнне Фронта паступова зменшылася. Беларускія рэаліі вымагалі новых палітычных кааліцый з новымі ідэямі. Аднак ідэя незалежнасці, у якую цяпер укладаецца разуменне не толькі суверэнітэту, але і дэмакратыі, будзе дамінаваць у палітычным жыцці краіны і надалей.

АП

## З'езд БХД: ці ў палацы, ці на вуліцы

31 кастрычніка пройдзе паўторны ўстаноўчы з'езд Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі. На момант падпісання нумара ў друк не было ніякай яснасці, дзе ён пройдзе. БХД атрымала 11 адмоваў ад розных памяшканняў.

Урэшце 26 кастрычніка сябры партыі звярнуліся да Лукашэнкі з просьбай прадставіць ім памяшканне рэзідэнцыі прэзідэнта. «Кажуць, там месца хапае. Зноў жа, побач з плошчай. Тым больш, мы, як маладыя і перспектыўныя палітыкі, пасля перамогі ўсё роўна збіраемся туды пераязджаць. З нецярпеннем чакаем Вашага адказу», — пішацца ў заяве. У выніку, кажа Павал Севярынец, «27 кастрычніка патэлефанавалі з Мінгарвыканкама і прапанавалі Палац культуры МТЗ. Самае цікавае, што на самім Трактарным заводзе нічога пра гэта не ведаюць. У любым выпадку, гатовы правесці з'езд як у памяшканні, так і на Кастрычніцкай плошчы. Калі ў палацы МТЗ, то а 10-й, калі на Плошчы — то аб 11-й гадзіне».

ЗП



**Рух «За Свабоду»**

паўстаў пасля прэзідэнцкіх выбараў 2006 года. Першы запіс сяброў арганізацыі адбываўся падчас вулічнай акцыі 25 сакавіка 2006 года. У Рух увайшло шмат сяброў іншых палітычных партый, якія падтрымліваюць Аляксандра Мілінкевіча. Зарэгістраваны ў снежні 2008 года. Лідэр — Аляксандр Мілінкевіч.



**Партыя БНФ**

была заснаваная ў маі 1993 года, хоць існавала да гэтага ў выглядзе грамадскага аб'яднання БНФ «Адраджэнне». БНФ быў першай альтэрнатывай Кампартыі ў нашай краіне. Першым старшынёй быў Зянон Пазняк. У Вярхоўным савеце XII склікання БНФ меў фракцыю з 37 чалавек. У 1999 годзе адбыўся раскол арганізацыі на Партыю БНФ і КХП–БНФ. У 2005 годзе БНФ вылучыла на выбары прэзідэнта Аляксандра Мілінкевіча. Старшыня — Аляксей Янукевіч.




**Беларуская хрысціянская дэмакратыя**

створаная ў пачатку 2000–х групай былых «маладафронтаўцаў» на чале з Паўлам Севярынцам. Партыя выводзіць сябе ад перадваеннай Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі. Сустаршыні БХД — Георгій Дзмітрук, Віталь Рымашэўскі, Павал Севярынец, Аляксей Шэін. У 2009 Мінюст адмовіў БХД у рэгістрацыі.



**«Малады фронт»**

паўстаў у 1997 годзе як моладзевая фракцыя БНФ. Праўда, праз некаторы час арганізацыя пайшла ў вольнае плаванне. Доўгі час «МФ» узначальваў Павел Севярынец. Сярод найбольш запамінальных акцый «Маладога фронту» — «Горад наш», святкаванне Дня святога Валянціна. Дзесяткі актывістаў «МФ» прайшлі праз суды за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі, арышты і турмы. Старшыня — Зміцер Дашкевіч.



**«Маладая Беларусь»**

з'явілася пасля расколу ў «Маладым фронце» восенню 2008 года. Узначальвае арганізацыю Артур Фінькевіч.




**Моладзевы хрысціянска-сацыяльны саюз «Маладыя дэмакраты»**

аддзяліліся ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі ў лютым 2009 года. Адразу заявілі пра больш цеснае супрацоўніцтва з Рухам «За Свабоду». Старшыня — Аляксандр Шумкевіч.



**«Правы альянс»**

заснаваны ў 2004 годзе пасля самароспуску Беларускай партыі свабоды. Арганізацыя прытрымліваецца правых, кансерватыўных, традыцыяналісцкіх каштоўнасцяў. Лідэр — Юры Карэтнікаў.




**Рух салідарнасці «Разам»**

устаноўчы сход адбыўся ў чэрвені 2009 года, у ім удзел узялі 57 чалавек. Старшынёй быў абраны Вячаслаў Сіўчык, а ягонымі намеснікамі прадпрымальнік Аляксандр Макаеў і былы камендант намётавага мястэчка Алесь Мазур.

## ВОДГУКІ

### «Аляксандр Мартыненка: Навіны БТ таксама будуць па-беларуску» («НН», №39)

**ЦАНА ПЫТАННЯ**

Із лабірынтаў мазаічнай сталі
мы выпаўзлі туды, скуль пачыналі.
Адно, засталіся ўваччу малюнкі:
фужэры бітыя і пацалункі.

Але ж Еўропа за пакет пап-корна
разлік запатрабуе жорсткім порна.

**Кнехт, Мінск**

**Добры крок**

Улада патаемна зрабіла вельмі добры крок. Тое, што б'е, зневажае, саджае ў турмы — дрэнна, што мову вяртае — добра. Будзем змагацца са злом. І не рабіць выгляд, што адбылося гэта без удзелу Лукашэнкі. Гэтак жа, як без яго ўдзелу не адбываецца ўціск свабоднай прэсы. Сказалі дурням, што пошта вінавата, яны і маўчаць. Якая к чорту пошта! Прэзідэнт кантралюе персанальна гэтае пытанне. Вось пра што трэба гаварыць.

**12, праз nn.by**

**Кроплі камень точаць**

Шмат гадоў Алег Трусаў, менчукі, абласныя і рэгіянальныя арганізацыі ТБМ пісалі лісты ад самых нізавых да сталічных чыноўнікаў аб пашырэнні беларускай мовы ва ўсіх сферах жыцця беларусаў. Дзесяткі тысяч подпісаў збіралі і за адкрыццё белмоўнага нацыянальнага ўнівера, і за сотні іншых мясцовых ініцыятыў. Што ж, кроплі камень точаць! І гэта — супер!

**Алесь Заходнік, праз nn.by**

### Пра перапіс насельніцтва, №39

**А ў нас — беларуская**

А ў нас у вёсцы перапісчык піша ўсім родную беларускую, не чакаючы адказу.

**Byllion, Валожынскі раён**

**Гномы — ідыёты**

Запісваюць сябе «гномамі» — чысты ідыятызм. Асабліва, калі яно практыкуецца дзеля такой актуальнай і важнай задачы, каб «праверыць стрэсаўстойлівасць перапісчыкаў».

Што да бланкаў, то, праўду кажучы, я абсалютна не разумею логікі тых арганізатараў перапісу, якія стварылі на роўным месцы гэтыя праблемы з беларускамоўнымі бланкамі. Няўжо нельга было іх надрукаваць у такой колькасці, каб кожнаму перапісчыку адразу ж даць хоць бы штук па 10? Мабыць, проста захацелі сэканоміць (як заўсёды, эканомяць на мове), але гэта дзіўная эканомія, бо па сутнасці яна дробязная, проста капеечная. І асабліва брыдка ўсё гэта выглядае дзеля таго, што наўкола шмат прыкладаў можна бачыць, калі вялікія грошы дзяржавай выкідаюцца на розную непатрэбшчыну.

**Алесь Юркавец, Лагойскі раён**

**Трохмоўе**

Удзельнічаю ў перапісе як перапісчык — адсоткаў 80—85 роднай называюць беларускую, адсоткаў 25—30 дома размаўляюць на беларускай, прыкладна столькі ж на расійскай і крыху больш — на змяшанай.

**Рыгор, праз nn.by**

**Яны ёсць, але іх няма**

«Усе папіснікі будуць забяспечаныя бланкамі на дзвюх мовах». Прыходзіць папісніца. Пытаюся ад парога: ці ёсцека белмоўныя бланкі. Высвятляецца, што няма. Папрасіў нумар пэпіснага офіса. Тэлефаную. Кабеціна адказвае: белбланкі ёсць, але дзяўчына, што перапісвала мой дом, іх забылася ўзяць. Карацей, атрымалася з бланкамі, як з той мовай: яны ёсць, але іх няма.

**Дымша, праз nn.by**

### «Міністр Латушка паскардзіўся ў кавярні на адсутнасць беларускага піва», №39

**Латушка малайчына. Я б яму праставіў не адзін куфаль!**

Ідыёты ад гандлю за адкаты гандлююць выключна імпартным півам. Беларускія маркі хмяльнога напою дыскрыдытуюць. Хаця замежныя госці спажываюць яго з задавальненнем. Я частуюся «Экпартным» ці тым жа «Культам» светлым ад «Крыніцы». Колькі гандлёвую мафію ні імкнуліся пасунуць — яна існуе. Рэакцыя на такія «піўныя» паводзіны гандляроў з боку ўрада павінна быць жорсткай і неадкладнай. Але ці будзе? Там жа піва не п'юць...

**12, праз nn.by**

***

Міністр яшчэ будзе прыватнаму бізнэсу галаву кампаставаць, якое прадаваць піва. Кніга скаргаў — гэта ўвогуле ідыятызм.

**Майсей Абрамавіч**

### «Паварот Лукашэнкі, або Мова Колі», №39

**Па-мойму, нічога асаблівага ў гэтых адказах няма.**

Лукашэнка адказаў так, як адказвае ці не большасць людзей ягонага пакалення — выхадцаў з вёскі. Але вось чамусьці вырашылі зрабіць з гэтага нейкую сенсацыю. Я не ўпэўнены, што і на мінулым перапісе Лукашэнка гэтак жа сама не адказваў. Дзякуючы гэтым людзям і на мінулым перапісе 37% беларускамоўных вымалявалася, і на гэтым ужо, вядома, не столькі ў колькасным сэнсе, але асноўную долю будуць складаць яны. Гэтым людзям якраз больш заімпануе, што прэзідэнт адказаў гэтак жа сама, як і яны — як жа, свой хлопец. Звычайны папулізм, і не больш таго. Асабіста я ў гэтых заявах не бачу анічога шматабяцальнага.

Увогуле, на пашырэнне беларускамоўнай школьнай адукацыі з боку ўладаў можна будзе разлічваць толькі тады, калі на такія школы будуць падавацца штогод ШМАТ заяў з боку бацькоў патэнцыйных іх вучняў. Пакуль замест заяў будуць палітычныя заклінанні — да таго часу на нешта разлічваць цяжка.

**Алесь Юркавец, Лагойскі раён**

### «Другім чалавекам у Нямеччыне стане гей», №38

**Ганьба!**

Немцы, ужо бачны ваш канец.

**Kandratowic**

***

Усім гамафобам як з апазіцыі, гэтак і з улады давядзецца лічыцца з міністрам замежных спраў. Ён міністр Нямеччыны! Калі мы за дэмакратыю, дык мусім лічыцца з дэмакратычнымі прынцыпамі і правамі.

**Рубіком**

***

Гэта здрада ідэі Хрысціянскай Дэмакратыі! Севярынец! Неадкладна разабрацца! Ату іх, ату!

**Магадан**

***

Ніхто з тых, каго кляймяць «гамафобамі», фобіі не маюць. І Севярынец, і Дашкевіч разглядаюць гомасэксуалізм як грэх — на што маюць права, якое называецца Правам на свабоду сумлення. Прычынай, чаму «палітычныя геі» клеяць направа і налева цэтлікі з дзіўным словам «гамафоб», з'яўляецца той факт, што людзі правацэнтрысцкіх перакананняў не бачаць неабходнасці ў перакройванні цэлага свету выключна пад патрэбы адной групы па палавых інтарэсах.

**Доктар**

***

Калі і раней ад немцаў дабра не чакалі, дык цяпер яшчэ горш будзе! Саюз крамлёўскіх карлікаў з нямецкімі геямі будзе падпісаны на ложку Берлусконі.

Ніколі не паверу ў гэта! Прагматызм і лібералізм не ў стане змагацца з таталітарызмам!

**Крывіч**

***

Тэма геяў у палітыцы — гэта, канечне, вельмі важна... Але для мяне дзіўна, што аўтар не звярнуў увагу на адну мале-е-енечкую акалічнасць — ганаровы старшыня партыі Свабодных дэмакратаў Геншэр нядаўна быў у Мінску і меў сустрэчу з прэзідэнтам.

**Дубатоўк**



# Святая зямля Беларусі для кожнага — свая

Беларусь — аб'ект вялікіх габрэйскіх пілігрымак. Вядомыя рабіны і іхнія вучні прылятаюць у мясціны, слынныя для іхніх папярэднікаў. З чарговай групай паломнікаў у Валожын падарожнічала карэспандэнтка НН.

Яны наведалі таксама Радунь, Мір, Пружаны і Брэст. У гэтых гарадах захаваліся габрэйскія святыні.

Гэтак, у мястэчку Радунь замежныя пілігрымы наведалі магілу слыннага рабіна Хофец Хайма, а таксама мясцовы клуб, дзе калісьці месцілася знакамітая ешыва — школа рабінаў. Стуль госці пераехалі ў Валожын, дзе захаваўся найстарэйшы з будынкаў ешываў Усходняй Еўропы. У Міры таксама яшчэ трымаецца стары будынак ешывы.

А ў Пружанах засталіся старыя могілкі, якім амаль 500 гадоў. У Брэсце ж аб'ектам пілігрымкі стаў... кінатэатр «Беларусь», збудаваны з былой галоўнай сінагогі горада. Варта адзначыць, што ў габрэйскіх колах ходзіць праект аднаўлення дзейнасці ешывы ў Валожыне.

**Юлія Дарашкевіч**

## ЛІСТЫ

### Зноў міф... Апошні?

**Патэлефанаваў знаёмы навуковец і ў гутарцы між іншым паведаміў, што чытаў пра мяне ў мемуарах Пятра Садоўскага «Мой шыбалет»: «Напісана ў цэлым станоўча, але крыху ў гумарыстычным плане...»**

Выявілася, што Пётра Садоўскі ўзнаўляе абставіны майго звальнення з працы ў Інстытуце мовазнаўства АН БССР, дзе я займаў пасаду старэйшага навуковага супрацоўніка. Галоўным чынам ён апісвае «пашыранае пасяджэнне навуковай рады» гэтага інстытута, якое адбылося, паводле яго слоў, увосень 1973 года (насамрэч разглядалася мая «справа» 22 сакавіка 1974 года).

Аўтар піша так, як хоча і як можа. Дый жанр аповеду — успаміны — непазбежна схіляе да фантазіі, а талент пісьменніка — да выкарыстання іроніі, гумару. І ўсё ж не варта мемуарысту забывацца на што-колечы і з прафесійнае сферы — дыпламатыі, а менавіта на такт.

Не маю права адмаўляць, што, паводле сведчання П.Садоўскага, гаварылася на пасяджанні — я там не быў. Натуральна, не мог тады бачыць П.Садоўскі і мяне — «невысокага чалавека, ці то хворага, ці то спужанага», «спужана-хворага чалавека».

Акурат тым часам (удзень) мы з Валянцінам Рабкевічам знаходзіліся ў маім інтэрнацкім пакоі (побач з тагачасным будынкам БелСЭ, дзе працаваў Валянцін) і палуднавалі. Была і чарка. Не як для «спужана-хворых» людзей!

Чаму я не пайшоў на пасяджанне? Папытаўся ў дырэктара Інстытута мовазнаўства М.Судніка, ці зменіць што мая прысутнасць. Ён сказаў, што фактычна ўсё вырашана, паступілі нейкія сакрэтныя матэрыялы... А мне, прызнаюся, не хацелася бачыць, як пры змене абставін былыя калегі робяцца амаль класавымі ворагамі.

Але вернемся да ўспаміну Садоўскага: «Выступілі яшчэ некалькі абураных. Вінаватага (г.зн. мяне – АК) выставілі перад залай. Ён маўчаў, не агрызаўся, значыць, каяўся».

Шкада, што такая карыкатурная абмалёўка «згорбленай постаці» «нацыяналіста» можа прымацца на веру чытачом.

У сапраўднасці ж было інакш. Пры допыце як сведкі ў КДБ (там засталося маё пісьмовае тлумачэнне) я ні пра каго не нагаворваў, а пазней у заявах-зваротах у высокія інстанцыі не мог прызнаваць прыпісванай мне віны.

Дарэчы, тэкст П.Садоўскага – не першая спроба стварэння міфаў вакол «справы» акадэмічных навукоўцаў. На адну з іх я адгукаўся ў друку, даводзячы, што падпольнай групоўкі з маім удзелам не існавала («Наша слова», 15.09.1993).

**Алесь Каўрус, Мінск**

### «Павязаныя з Расіяй»

**З цягам часу пачаў ужо думаць, што я, як і той Саламон, «усё бачыў за гады марнасці маёй», але ж, як і ён, падмануўся.** А разбурыла маю ўпэўненасць праграма навінаў Першага канала БТ, што транслявалася 12 кастрычніка а 19-й гадзіне. Тэкставы радок, што няспешна поўз пад шматмоўным каментатарам, паведаміў:

«У Ватыкане да ліку святых сёння прылічана пяць чалавек, сярод іх Зыгмунт Фялінскі, доля якога цесна звязана з Расіяй».

Мяне ажно паралізавала. Так і не здолеў уцяміць, чаго ж у гэтым сказе болей: глупства або цынізму.

Чым жа так шчыльна павязала з сабой Расія народжанага ля Луцка, выпускніка Сарбоны Фялінскага? Ды тым самым, што і іншых сумленных, неабыякавых да лёсу свайго краю людзей сярэдзіны XIX ст.

Напачатку павязала яна маці будучага біскупа Варшаўскага, якая была высланая ў Сібір, і шасцёра дзетак фактычна засталіся сіротамі і без даху над галавой. [Дарэчы, маці была родам з Беларусі. А тата быў родам з Вільні. Абодва паходжаннем з беларускай шляхты. — Рэд.]

Павязала яна і кіраўніка полацкага паўстанцкага аддзела Антона Грабніцкага, які памёр на этапе. Павязала і знакамітага дзеяча беларускае культуры Арцёма Вярыгу-Дарэўскага, якога смерць напаткала ў Сібіры. Урэшце павязала на Лукішках і Кастуся Каліноўскага. Прыйшла чарга і да біскупа. Пасля пратэсту супраць рэпрэсіяў царскіх уладаў 14 чэрвеня 1863 г. ён быў высланы за Яраслаўль, дзе правёў у высылцы цэлыя 20 гадоў.

Больш з Расіяй павязаныя толькі тыя, хто навечна спачыў на халодных абсягах Сібіры.

**Міхась Баўтовіч, Полацк**

### Кароль голы, а літаратура — бяззубая

**Назваўшы сучасную беларускую літаратуру «бяззубай», Андрэй Хадановіч назваў караля голым. Яна даўно бяззубая.**

Найяскравейшы прыклад — адсутнасць сатырычнага жанру. Пакінем убаку асобныя прыватныя спробы з азіраннем на рэакцыю ўлады — і на ўсякі выпадак з рэверансам да яе! («Сказ пра Лысую гару»).

Беларуская літаратура як нарадзілася пад забойцам-цэнзурай, так і не выйшла з-пад яе. Цэнзура магла быць моцнай ці слабай, але яна нішчыла свабодную думку заўжды.

Тое, што сказаў Хадановіч, карысна і патрабуе разваг, аналізу і нават цэлай кніжкі кшталту «Літаратура пад прэсам». Тэма пачварнай цэнзуры агромністая.

Дзякую, спадар Андрэй. У Вас выдатныя лімерыкі.

**Мікалай Бусел, народны чытака, Дуброва (Светлагорскі р-н)**

### Танныя беларусы

**«Нафтан», Мазырскі нафтаперапрацоўчы і яшчэ сёе-тое — гэта салодкі кавалачак як для Захаду, так і для Расіі.**

А чарговы крэдыт мы пасяхова праядзім і пра...м, мы да гэтага ўжо звыкліся.

Але ўжо хутка давядзецца плаціць па крэдытах, а іх у нас шмат, — і вось тады ў нас выбару амаль што не будзе, і тое, што нечага каштуе, будзе пакрысе распрадавацца.

А напрыканцы застанемся мы — беларусы — са сваім апетытам, нікому не патрэбныя і з гэтай нагоды вельмі танныя.

**Фрыд, праз nn.by**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскія відэа і фоты. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА-версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

# Памечаны

**26 кастрычніка споўнілася б 50 гадоў Анатолю Сысу. Праклятаму паэту.**



Сыс быў нібы памечаны ад самага ягонага нараджэння.

Калі маці, настаўніца пачатковых класаў, была ім цяжарная, яна праз неасцярожнасць зрабіла пажар. Маці абгарэла. У тую самую ноч нарадзіўся Анатоль.

Гэта здарылася ў 1959 годзе ў вёсцы Гарошкаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. На беразе Дняпра, у адным з самых старажытных пасяленняў чалавека ў Беларусі. Ён быў найменшы з чатырох дзяцей у сям'і Марыі іЦіхана Сысоў.

Само прозвішча, як імя мага — Сыс.

У траўні 2005 г. суседка паэта звярнула ўвагу, што ў Анатолевай кватэры трое сутак гарыць святло. Выбілі дзверы. Паэт быў ужо колькі дзён нежывы. Прычыны смерці няясныя. Паэт моцна піў.

Пахавалі Сыса ў родным Гарошкаве.

Асоба і месца Сыса ў паэзіі выклікае спрэчкі. Хтосьці ставіць яго ўпоравень з Купалам і Багдановічам. Іншыя заклікаюць крытычна ставіцца да часоў, калі паняткі «эліта» і «багема» памылкова атаясамліваліся.

Ён быў панк і нават бажаволак.

На занятку ў «Гомельскі дзяржаўны унівэрмаг» ён і ягоныя сябры хадзілі ў куфайках і гумовых ботах. Падчас лекцыяў дэманстраўна елі сала з цыбуляй. Станавіліся кардонам перад уваходам на дыскатэку і пускалі толькі тых, хто цалаваў чырвона-зялёны БССРаўскі сцяг... Чысты панк познесавецкай эпохі, з дапамогай якога імкнуліся намацаць, зразумець — што ж яно такое, твая Беларусь.

Ён мог з п'янымі ў зюзю сябрамі заваліцца да паэта-пачаткоўца: «Я прыйшоў цвярозы слухаць твае новыя вершы». Ён абклеіў сцены бара Дома літаратара чырвонцамі — ганарарам за кніжку.

Але ніхто не адмаўляе, што Беларусь і паэзія былі для Сыса ўсім. Да іх ён, блюзнер і бажаволак па жыцці, ставіўся надзвычай сур'ёзна.

31 кастрычніка ў вёсцы Гарошкаў на Гомельшчыне пройдзе вялікі літаратурна-музычны фэст, у часе якога на сцяне роднай хаты паэта будзе адчыненая мемарыяльная шыльда.

**Сяргей Мікулевіч**

## АНАТОЛЬ СЫС

СЭРЦА

Мне на сэрцы золатам вышывалі краты,
кроў балюча крапала на маю душу
з голкі дыяментавай аж у тры караты —
вось якое дзіва я ў грудзях нашу.

А бывае, падаю з усяго размаху,
дык на сэрцы золатам шэсць крыжоў звіняць
аб зямельку родную, быццам меч аб плаху, —
ні вінoм, ні лекамі боль той не суняць.

Дзе ўпаду, каб ведаў я, дык падклаў падушку б,
але ж вочы–зоркі сочаць, на бяду,
мабыць, цяжар кратаў датуль насіць мушу,
пакуль у магілу–матку не ўпаду.

Мне на сэрцы золатам лёс мой вышывалі,
нітак не хапіла на апошні прэнт,
а калі паўмёртвага мяне пакідалі,
уваткнулі ў сэрца голку–дыямент.

Можа, каму трэба залатая нітка,
голка з дыяменту, я вас папрашу,
калі вам няцяжка, калі вам нябрыдка, —
выратуйце сэрца, вызвальце душу!

Гэта ж вельмі проста: нітку — у клубочак,
голку — у скарбонку, што ў крыві — дарма,
без віны ды боязі спіце сабе ўночы,
ну а вашым ворагам сніцца хай турма.

З матамі, вар'ятамі,
з сабакамі іклатымі,
ды пад аўтаматамі
з залатымі кратамі
будзе
хай
яна!

## СЦІСЛА



### Бураціна — беларускі

Кінастудыя «Беларусьфільм» мае намер падаць іск на Дзяржтэлерадыёфонд Расіі аб абароне правоў на «Прыгоды Бураціна». У архівах Дзяржтэлерадыёфонду ляжаць 170 фільмаў, знятых на «Беларусьфільме». Карціны накіроўваліся туды ў савецкі час.

### Сувораўцы любяць Быкава і Караткевіча

кажа загадчыца бібліятэкі мінскай суворaўскай вучэльні. Чытаць Васіля Быкава, напрыклад, сувораўцам раіў вайсковы лётчык генерал-маёр у адстаўцы Анатоль Сульянаў. Акрамя праграмнай літаратуры, навучэнцы МСВВ чытаюць фантастыку, гістарычныя творы. Напрыклад, «За морам Хвалынскім» Вольгі Іпатавай.

### Кніга Ігара Бабкова — у фінале еўрапейскай прэміі

Перакладзены на польскую мову раман пісьменніка Ігара Бабкова «Адам Клакоцкі і ягоныя цені» трапіў у фінал літаратурнай прэміі Цэнтральнай Еўропы «Angelus». Лаўрэат атрымае 150 тысяч злотых (каля 53 тысяч даляраў).

**СМ**

# Галдзянкоў: Мне смешна чытаць расійскіх гісторыкаў

У «НН» №37 быў надрукаваны водгук Уладзіміра Арлова на кнігу Майкла (Міхаіла) Галдзянкова «Русь — другая история». Ён называўся «Дапытлівы школьнік Галдзянкоў або Мы, беларусы, — русские люди». Мы звярнуліся да аўтара кнігі, каб высветліць яго пазіцыю.

**«НН»: На водгук Уладзіміра Арлова пакрыўдзіліся?**

**МГ:** Я люблю крытыку. Мне іранічнасць яго артыкула спадабалася. Толькі Арлоў не зразумеў, што я не называю рускімі маскавіцян часоў бітвы пад Оршай, бо гэта яшчэ не рускія людзі.

**«НН»: Чаму ўсё ж такая назва — «Русь — другая история»?**

**МГ:** Бо Русь — гэта не дзяржава. Гэта землі, ахопленыя старажытнарускай культурай: Ноўгарадская рэспубліка, Пскоўская рэспубліка, Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ)...

ВКЛ ніколі не было выключна рускай дзяржавай, але большасць яго насельнікаў былі праваслаўнымі. А праваслаўная царква называлася рускай царквой. Духоўным цэнтрам гэтых людзей быў Кіеў. Скарына называў сябе рускім па веравызнанні. І Біблію выдаў рускую.

А вось у Масковіі рускага не было абсалютна нічога. Яны называлі сваю рэлігію грэчаскім праваслаўем. А калі ў Маскву прыехаў Максіміліян Грэк і назваў маскавіцян схізматыкамі, яны яго пасадзілі ў турму.

Да Ламаносава сучаснай расійскай мовы не існавала. Калі Пётр Першы пачаў галіць бароды і здымаць чалмы, то шмат хто пакрыўдзіўся. Спачатку Аляксей Міхайлавіч, а найбольш ягоны сын Пётр Першы зрабілі з Масковіі Русь. Ён на Захадзе рэкамендаваў усім пісаць замест Масковіі — Расія.

Што да беларусаў як рускага народа, то гэта ж не мая думка. Так Караткевіч лічыў. Словы, што мы больш рускія, чым самі рускія, належаць менавіта Караткевічу. Так яно выходзіла. Гэта потым тэрмін «рускія» скрала ў нас Масква.

**«НН»: Адкуль у Вас такое негатыўнае стаўленне да Масквы? Вы ж сам родам з Расіі, пераехалі ў Беларусь ужо сфармаваным чалавекам.**

**МГ:** Негатыву няма. Ёсць апісанне гістарычных падзей. З Масквой беларусы вялі пастаянныя войны, і Масква знішчала беларусаў. Як этнас і як дзяржаву. Кожны другі беларус загінуў у вайне з Аляксеем Міхайлавічам. Якое можа быць станоўчае стаўленне...

**«НН»: Чаму Вы абралі гістарыю тэмай для сваіх апошніх кніг?**

**МГ:** Таму што гэта самая белая пляма. Гэта тое, на што трэба кідацца і прыкрываць, як амбразуру. Гэта зараз галоўная задача творчай інтэлігенцыі Беларусі. Ураtаваць сваю гісторыю, ураtаваць сваю мову. Усім трэба запісвацца ў перапісе, што размаўляеш па-беларуску. Бо культурны ціск з усходу можа прывесці да знікнення культуры.

А нашы гісторыкі пішуць так, каб не дай Бог потым газ не адключылі. Крыўдна, што папулярных кніг мала гістарычных. На мяне наракаюць — знайшоўся малады, вучыць нас зараз.

**«НН»: Крытыка Вас не спыніць?**

**МГ:** Мне гэта нагадвае гісторыю з сібірскімі мужыкамі. Якім далі бензапілу. А тыя, пакуль не сапсавалі яе, не маглі прынаравіцца ёй карыстацца. Я хачу паказаць рознасць культур Масквы і Вялікага Княства Літоўскага, а не называць Вялікае Княства часткай Масквы.

Няважна, што нейкія драбніцы апісаныя памылкова: расстралялі манахаў Полацка альбо пасеклі шаблямі. Важна, што падлеткі са здзіўленнем усё слухаюць, што я ім расказваю. У школах жа нічога ім не кажуць.

На мой погляд, добра быць дапытлівым школьнікам. Колькі жывеш, столькі і вучыся. А гісторыю трэба пісаць зыходзячы толькі са сваіх, беларускіх інтарэсаў. Не азіраючыся на суседзяў.

**Гутарыў Алесь Пілецкі**

# Выстава месяца


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Вельмі вартая выстава «Міленіум» адкрылася ў мінскім Палацы мастацтва. Яна прысвечаная 1000-годдзю першай згадкі ў пісьмовых крыніцах Літвы. І сабрала цвет беларускага мастацтва. Сярод удзельнікаў — Арлен Кашкурэвіч, Аляксей Марачкін, Уладзімір Вішнеўскі, Леў і Сяргей Гумілеўскія. Усяго звыш 300 аўтараў. У экспазіцыі — жывапісныя, графічныя працы, скульптура. Тысяча твораў. Тут можна паглядзець і рэканструкцыі старажытных строяў. Гэта адзін з нешматлікіх выпадкаў, калі на карцінах адлюстраваны бел-чырвона-белы сцяг і Пагоня, а выстава ладзіцца ў вялікай зале.**

# Міхалок перавабіў чытачоў Хадановіча

23 кастрычніка ў Мінску прайшоў міжнародны фестываль «Вялікае Княства Паэзіі». Аўтараў сабралася ажно васемнаццаць. Дзве гадзіны падзялілі на ўсіх. Гэта было выпрабаванне для паэтаў. Ехаць у далёкую краіну, каб выступіць з парай-тройкай вершаў...

Свабодных месцаў у зале Акадэміі мастацтваў хапала. Раней на імпрэзы з удзелам Андрэя Хадановіча разлічаная на паўтысячы месцаў зала была поўнаю. Паэт губляе папулярнасць? Наўрад ці. Віной таму стала паралельная паэтычна-мадэльерская вечарына ў бібліятэцы Цёткі, што сабрала 60 чалавек, а перадусім «Рок па вакацыях», што праходзіў у той самы вечар у «Рэактары» з удзелам «Ляпіса Трубяцкога».

**Кастусь Матушыч**

# Сем невядомых скульптураў Мінска

**У сталіцы стаяць помнікі ў гонар крывічоў і Еўфрасінні Полацкай, а таксама сантэхніку ды майткам.**

Напярэдадні свята прыгожага пісьменства ў Смаргоні, дзе ўрачыста ўсталявалі помнік Францішку Багушэвічу, літаратар і багушэвічазнаўца Уладзімір Содаль са скрухай зазначыў, што на мінскай плошчы імя Багушэвіча, што за Музычным тэатрам, дагэтуль няма помніка «віноўніку» назвы.

Так, сапраўды шмат хто з дзеячаў, чые імёны вартыя плошчаў і праспектаў, увасоблены пакуль у мініпомніках у засені падворка БДУ. Там ад вока неўтаямнічаных мінчукоў хаваецца цэлы нацыянальны пантэон. Але, разам з тым, на сталічных вулках ужо стаяць помнікі крывічам, Еўфрасінні Полацкай, а з больш экзатычных мінскіх скульптураў — помнікі сантэхніку і нават майткам.

## Еўфрасіння і Касцюшка ў цэнтры сталіцы

Помнік асветніцы Еўфрасінні Полацкай знаходзіцца ля ўваходу ў Інстытут сродкаў аўтаматызацыі на цэнтральнай вуліцы горада — праспекце Незалежнасці (ля будынка №117) — якіх паўкіламетра ад «нацыяналкі». У свой час скульптуру прытуліла кіраўніцтва інстытута, калі помнік не прайшоў атэстацыі. Яго палічылі замалым і адмовіліся ўсталёўваць у іншым, больш выгадным месцы. Пастамент помніка мае форму разгорнутае кнігі.

Непадалёк ад вучэльні, названай у гонар расійскага палкаводца і душыцеля паўстання 1794 года Аляксандра Суворава, стаіць бюст завадатара таго ж паўстання Тадэвуша Касцюшкі. Толькі гэты бюст так проста не ўбачыш — ён знаходзіцца ў сярэдзіне будынка Амбасады ЗША (Старавіленская, 46). Як вядома, Касцюшка — нацыянальны герой не толькі Беларусі і Польшчы. У чыне генерала ён браў удзел у вайне за незалежнасць ЗША. За гэта яго і шануюць у Амерыцы.

## Крывічы ля «Валгаграда»

На Паўднёвым Захадзе, перад гандлёвым цэнтрам «Валгаград», стаіць зробленая яшчэ ў 1980-я скульптурная кампазіцыя, прысвечаная племені крывічоў. Але чаму ля «Валгаграда»? Дамо слова скульптару Алесю Шатэрніку: «За савецкімі часамі было прынята называць гандлёвыя цэнтры паводле гарадоў СССР: «Рыга», «Вільнюс». Я атрымаў заказ зрабіць праект скульптурнай кампазіцыіі перад гандлёвым цэнтрам «Валгаград». Ну, што можна зрабіць на тэму «Валгаград»: не «Радзіму-маці» ж з мечам капіяваць? І я стварыў кампазіцыю, што была блізка майму сэрцу, пра крывічоў. У прыёмнай камісіі запыталіся, якая сувязь між Валгаградам і продкамі беларусаў, крывічамі, я адказаў, што нашыя продкі хадзілі на ладдзях далёка на Усход, ажно да Волгі. Камісія пасмяялася, але праект ухвалілі».

## Помнік скрадзеным майткам

Ва Уладзіміра Жбанава, аўтара гарадскіх скульптураў «Дзяўчынка з парасонам» і «Курэц», што ў Міхалаўскім скверы, быў папярэднік. Гэта скульптар Мікалай Кандрацьеў. Паводле яго праекта яшчэ ў савецкія часы на вуліцы Харужай (ля дома 14) усталявалі «скульптуру малых формаў», трапна ахрышчаную мінчукамі «Аддай майткі!». У цэнтры гарэзлівай кампазіцыі «Гуляючых дзетак» — сподняе аголенага хлопчыка, якое ў запале адбірае малая дзяўчынка.

Працу сантэхніка ў нас паважаюць. Вось на вуліцы Караля, недалёка ад крамы «Радыётэхніка», нават усталявалі помнік у гонар работніка помпы і пракладкі. Скульптар замілавана дадаў да скульптуры сапраўдны разводны ключ і кран. Заўважым, што за колькі месяцаў свайго існавання гэты помнік, які стаіць без пастамента пасярод звычайнага мінскага двара, ні разу не рабіўся аб'ектам нападу блюзнераў. На «Сантэхніка» па першым часе хіба колькі разоў мала не наехалі на сваіх аўто ўражаныя скульптурай жыхары.

## Кіраў ды іншыя кіраўнікі

Акрамя двух выяваў Дзяржынскаму і процьмы Леніных, у Мінску непарушна стаяць помнікі іншым камуністычным дзеячам, пра якіх і ў самой калысцы бальшавіцкай рэвалюцыі, пэўна, забыліся. На рагу вуліц Кульман і Коласа (праўда, на тэрыторыі завода) стаіць помнік Сярго Арджанікідзэ, наркаму цяжкай прамысловасці і намесніку Сталіна. А на вуліцы Першамайскай — бюст аднаго з правадыроў перадваеннага СССР, застрэленага ў 1934 г. пры загадкавых абставінах, Сяргея Кірава.

А на вуліцы Кедышкі (ля дома 33) сярод парку вырас экзатычны парастак беларускай абстракцыі. Ён пакуль кволы, але заўважна ажыўляе прылеглы сквер. Спадзяемся, абстракцыяў на вуліцах Мінска будзе больш, каб не толькі перад старымі помнікамі камуністычным правадырам мінчукі спыняліся і няўцямна пыталіся: «А гэта хто?»

**Павал Касцюкевіч, фоты аўтара**
















# Спецыялісты па маральнасці

## Стэнаграма пасяджэння, якога не было, але якое магло быць. Пераклад з расійскай

**Аляксандр Апон.** П'еса.

Асобы:
**Пісьменнік**
**Поп**
**Акадэмік**
**Рэжысёр**
**Мастак**
**Ідэолаг**

*Пакой у доме пісьменніка. Уваходзяць поп, акадэмік, рэжысёр, мастак і ідэолаг.*

**Пісьменнік:** Прашу, панове, прашу! Сядайце. Вось за гэты стол. (*Чакае пакуль усе рассядуцца.*) Сёння ў нас, панове, папярэдняе пасяджэнне, дзеля агульнага азнаямлення з мэтамі і задачамі нашай Грамадскай рады, якую я (*падымае палец угару*), з найвышэйшага дазволу, маю гонар узначаліць. А мэты і задачы ў нас з вамі, я б сказаў без лішняй сціпласці, высакародныя і планаў (*разводзіць убакі рукі*) — грамаддзё!

**Поп** (*трубным голасам*)**:** Урокі праваслаўя ў кожную школу — вось наша адзіная мэта і задача ныне і прысна!

**Пісьменнік:** Пачакайце, бацюшка, не перабівайце. Пра ўрокі мы яшчэ пагаворым, бо ёсць таксама іншае, на чым мы павінны (*палец угару*), з высачайшага дазволу, засяродзіць увагу. І тут важней за ўсё праблема п'янства, а адсюль сям'і і дзяцей.

**Рэжысёр** (*ускочыўшы з месца*)**:** Гэта не праблема, а невядома ўжо што — цмок нейкі. Ён нас усіх з'есць!

**Акадэмік:** І што вы прапануеце?

**Рэжысёр** (*хвалюючыся*)**:** Як што!(*Выцягвае з партфеля аркуш.*) Вось у мяне сцэнарый. Ён і яна. Ён рабочы на будоўлі, а яна кранаўшчыца.

**Ідэолаг:** Сябры БРСМ.

**Рэжысёр** (*згодна хітнуўшы галавой*)**:** Сябры БРСМ. І вось у абедзенны перапынак ён падымаецца да яе з кветкамі на кран і там, не марудзячы і —прашу звярнуць увагу — цвярозы, робіць ёй дзіця!

**Акадэмік:** Не, вы нешта гэта, не таго. Як гэта яны ў кабіне на кране дзіця па-вашаму робяць? Вы калі-небудзь, паважаны, на кран лазілі?

**Рэжысёр** (*шчыра*)**:** Не, не лазіў. Высока.

**Акадэмік:** Вось у тым жа і справа!

**Мастак:** Ну, мне таксама здалося, што ў кабіне на кране дзіця рабіць неяк няёмка, бо куды ёй дзяваць ногі? А вось калі падымаўся па лесвіцы, нічога сабе. Тут можа вымалявацца цікавая кампазіцыя на наваколле з вышыні птушынага палёту. Дайце мне аловак. Я вам зараз пакажу...

**Пісьменнік** (*спалохаўшыся*)**:** Не, зараз не трэба. Потым мо. (*Да рэжысёра.*) І гэта, ну што вы выдумляеце? Якія ногі, навошта?

**Рэжысёр:** А! Тады вось (*выцягвае з партфеля другі аркуш*). Ён і яна.

**Ідэолаг:** Абое сябры БРСМ.

**Рэжысёр:** Абое сябры БРСМ. Яна яго чакае з працы, гледзячы па тэлевізары «Не нарадзіся прыгожай» і «Часткі цела», а дачакаўшыся, пасля гарбаты з абаранкамі, ідзе ў спальню, дзе, распрануўшыся, кладзецца у ложак.

**Пісьменнік** (*пачухаўшы патыліцу*)**:** Гэта ўжо іншая справа. Але таксама: што вы ўсё ў рэшце рэшт на натуралістычныя сцэны скочваецеся?

**Рэжысёр:** А чым бліжэй да натуры, тым лепш!

**Акадэмік:** Гэта сапраўды так. Бачыў тут неяк адно кіно. І таксама ён з ёю. Дык ужо да таго натуралістычна паказана, што вачэй не адарваць.

**Мастак** (*махнуўшы рукой*)**:** Э, ды што там кіно. Прыходзьце як-небудзь да мяне ў студыю, не гэткае забачыце. Акрамя дзевак, бывае адзін міністр і з пракуратуры ўдваіх, але таксама — свае хлопцы ў дошку!

**Поп:** Цьфу, брыдота! Жыццяпіс святых — вось якое нам кіно патрэбна.

**Пісьменнік:** Пачакайце, бацюшка. Пра святых мы яшчэ пагаворым асобна. (*Да рэжысёра.*) І вы таксама сядайце, прашу. Тут над сцэнарыем трэба будзе папрацаваць. Я мо як-небудзь вазьмуся сам. А цяпер усё ж дазвольце пра мэты і задачы, бо акрамя праблемы з п'янствам, ёсць таксама яшчэ адна, на якой я хачу засяродзіць вашу ўвагу, а менавіта на бяздушнае стаўленне чыноўнікаў да народных патрэб і спадзяванняў. І вось яскравы прыклад: прыязджаю ў Адміністрацыю, заходжу да аднаго, што на трэцім паверсе сядзіць. І бачу нешта сапраўды несамавітае, як быццам гэта не я, а нехта іншы перад ім і не з высачайшага (*торкае пальцам у столь*) дазволу, а сам па сабе. «А што, — пытаецца, — за рада? А навошта? Хіба, — пытаецца, — у нас радаў не хапае?» Мурло гэдакае! Далей — болей. Я яму: «Будуць расходы». А ён: «Якія?» Я: «Не ведаю, розныя». А ён: «Грошай няма». «Як, — тады пытаюся,— няма?» «На «Славянскі базар»і «Дажынкі», — кажа, — пайшлі». І кропка.

**Рэжысёр** (*падскочыўшы*)**:** Сволач! Сволач! Ды я яму! Ды я пра яго! (*Лезе ў партфель.*) Вось, вось у мяне... (*Выцягвае аркуш і, спяшаючыся, каб не перапынілі.*) Ён і яна. Ён — чынуша якіх мала, а яна — курва што свет не бачыў — ягоная сакратарка. І таксама з БРСМ.

**Ідэолаг** (*прыўстаўшы*)**:** Што!?.. Мо з БНФ?

**Рэжысёр:** Так, прабачце, з БНФ. І вось у самы разгар працоўнага дня, калі справы патрабуюць неадкладнага вырашэння, яны, зачыніўшыся на ключык у кабінеце...

**Акадэмік:** А з якога гэта часу ў нас бээнэфаўцы ў чыноўніках ходзяць? Хто дазволіў?

**Рэжысёр:** Ніхто не дазваляў. Ён пралез!

**Акадэмік** (*заківаўшы галавой*)**:** А-а, ну-ну. Гэта іншая справа. Але, выбачайце, не ў Адміністрацыю ж (*падымае палец угару*), бо не веру!

**Рэжысёр:** Не, у Адміністрацыю самога...гэтага... вядома, не. Толькі гэта не той, а другі, што прымазаўся.

**Ідэолаг:** У нас прымазаных няма. У нас з імі размова кароткая — за каўнер і ў фортку. Заўтра пастаўлю пытанне ў прэзідыуме аб выключэнні гада!

**Поп** (*з характэрным бляскам у вачах*)**:** На допыт узяць, на допыт... «Што, быдла, аўтакефаліі захацеў?» І ў манастыр, на хлеб і ваду.

**Пісьменнік:** Пачакайце, бацюшка, пачакайце. Потым, калі што, у манастыр, бо ўрэшце на ўсё згадзіўся і яшчэ зверх таго, што я прасіў, дадаў на нямэтавыя выдаткі. (*Бярэ са стала і падымае над галавой аркуш.*) Вось іх спіс!

**Акадэмік:** Дайце зірнуць!

**Рэжысёр:** І мне!

**Мастак:** Хоць адным вокам...

**Ідэолаг:** Няўжо на злёт актывістаў на Нарачы адваліў?

**Поп:** Не, на Усяленскі Сабор.

**Пісьменнік** (*схаваўшы аркуш у кішэнь*)**:** Вам, бацюшка, на новую расу хопіць, ды яшчэ матушцы перападзе, на панчохі там, ці што. Але не за прыгожыя яе вочы, а за шчырую і адданую працу на карысць бацькаўшчыны, у асобе нашага дарагога, усімі любімага кіраўніка. Бо, як казаў адзін... э-э... ужо не ўспомню:

Ён і Радзіма — блізняты-браты.
Я кажу Ён, маю на ўвазе Радзіму,
Кажу Радзіма, маю на увазе Ён.

І тут, прыкра, але не перавяліся ў нас яшчэ нядобразычліўцы, ці нават — адкрытыя ворагі. І мы ўсе, разам, бацюшка, з матушкай, грудзьмі павінны легчы, каб абараніць яго ад гнюсных нападаў купкі ашалелых нацыяналістаў-вырадкаў, якіх мы ведаем пайменна. Вось проста на гэтым тыдні (*бярэ са стала газету*), у гэтым брудным лістку, які яны на амерыканскія грошы пускаюць у свет, быў змешчаны гэтак званы артыкул. (*Бярэ акуляры і, начапіўшы іх на нос, чытае.*) «А хто ж, у рэшце рэшт, маці?» (*Здымае акуляры і пасля працяглай паўзы, у час якой ніхто не вымаўляе ні гуку, са скрухай*). Складаная справа сям я. І нікому (*стукае пальцам па стале*) не дазволена лезці ў яе бруднымі рукамі, нават і ў выглядзе артыкула! (*Раптам крычыць ажно закалаціўшыся і збялеўшы ад гневу.*) Мярзотнікі, погань прадажная, сабакі! Ён жа не для сябе, а дзеля усёй краіны стараўся, пра увесь народ думаў!

**Акадэмік:** Так, выключна пра ўвесь народ.

**Пісьменнік** (*трохі спакайней*)**:** Дурань жа на дурні сядзіць. Ды каб не ён — з голаду паапухалі б, зямлю грызлі б. Бо ўсё, усё ён — і арэ, і цвікі забівае, і ў дазоры начэй не спіць. Ну, яшчэ мы дапамагаем, але маючы гэткі кволы розум, кроку, каб ён пальцам не тыцкнуў куды, ступіць не можам і не павінны! Таму не патрабуйце ад яго таго, што вышэй нашага разумення!

**Рэжысёр** (*ускочыўшы з месца*)**:** Правільна. (*Вырывае з партфеля аркуш.*) Вось у мяне сцэнарый. Ён і яны. Ён адзін, а іх — дзесяць міліёнаў. Але ён — святло, якое няўхільна напаўзае на неба з Усходу, а яны — нешта шэрае, невыразнае, быццам статак быдла у ранішнім тумане...

**Пісьменнік:** Так-так, вельмі прыгожа. Толькі сюррэалістычна... Быдлу не зразумець. Але гэта нічога, бо, галоўнае, правільны кірунак думкі. Такім чынам, папярэдняе пасяджэнне нашай Грамадскай рады па маральнасці лічу паспяхова скончаным . Пра першае пасяджэнне, якое адбудзецца ў Адміністрацыі на трэцім паверсе, я паведамлю дадаткова. А цяпер, калі няма пытанняў, прашу, панове, у сталовую: закусім, чым Бог паслаў.


ГЕРАНІМ БОСХ. КАРАБЕЛЬ ДУРНЯЎ




## КАНЦЭРТЫ

### Фестываль «Беларуская музычная восень»

**28 кастрычніка** — «Ігар Квашэвіч запрашае сяброў». У праграме класічныя, джазавыя і эстрадныя кампазіцыі. **29 кастрычніка** — канцэрт лаўрэатаў маскоўскага міжнароднага конкурсу скрыпачоў імя Д.Ойстраха. У праграме: І.С.Бах, І.Брамс, Н.Паганіні, Э.Ізаі, М.Равэль, Ж.Бізэ. **30 кастрычніка** — канцэрт «Запрашэнне ў краіну дзяцінства», прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння Яўгенія Глебава. **31 кастрычніка** — «Класік-Дуэт». У праграме творы П.Сарасатэ, А.В'етана, Дж.Гершвіна, А.Цыганкова. **1 лістапада** — Астар Пьяцола «Жарсці па танга». **3 лістапада** — выступае «Новы расійскі квартэт» (Масква). У праграме творы Ф.Шуберта і І.Брамса. **4 лістапада** — канцэрт «У садзе сусвету» ў выкананні Надзеі Мікуліч і Грыгорыя Палішчука. **5 лістапада** — «Шэдэўры сусветнага арганнага мастацтва» ў выкананні Рональда Эбрэхта (ЗША). Прагучаць творы Ф.Пуленка, Г.Бранта, Н.Бруса, Дж.Кейджа, У.Олбрайта, Д.Харда, С.МакЦі. **6 лістапада** — выступае Нацыянальны акадэмічны Народны аркестр Рэспублікі Беларусь імя І.Жыновіча. У праграме — папулярныя песні ансамбля «Песняры» Уладзіміра Мулявіна. **7 лістапада** — выступае Нацыянальны акадэмічны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.Цітовіча. **Пачатак канцэртаў а 19-й.**

### DJ-Battle Halloween!

**30 кастрычніка ў клубе Fabrique (вул. Мяснікова, 25; 4 паверх)** — DJ-Battle Halloween! **Пачатак а 23-й.**

### Алесь Камоцкі ў Купалаўскім

**29 кастрычніка а 19-й** Алесь Камоцкі запрашае на «Невялікі канцэрцік для вузкага кола» **ў Купалаўскім музеі**.

### Ансамбль з Венесуэлы

**У Малой зале імя Р.Шырмы 7 лістапада а 19-й** — канцэрт ансамбля «Плектра канцінуа» (Венесуэла).

### «Разбітае сэрца пацана»

**27 кастрычніка ў «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — «Разбітае сэрца пацана». **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ

### «Святыя дзяды, завём вас...»

V міжнародны фолк-фэст «Таўкачыкі» на Дзяды, альбо Halloween па-беларуску» пройдзе **3 лістапада на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы**. Гэта містычна-тэатралізаваны канцэрт паводле паэмы Адама Міцкевіча «Дзяды» і народнага абраду ўшанавання памерлых продкаў.

### 50-годдзе Сыса: свята паэзіі ў Гарошкаве

**31 кастрычніка ў вёсцы Гарошкаў, што над Дняпром каля Рэчыцы**, адбудзецца традыцыйнае свята паэзіі ў гонар Анатоля Сыса. Бяруць удзел родныя і землякі Анатоля, ягоныя сябры, а таксама паэты, барды і мастакі. У тым ліку: Генадзь Бураўкін, Уладзімір Някляеў, Уладзімір Арлоў, Эдуард Акулін, Алесь Камоцкі, Міра Лукша, Кася Камоцкая, Алесь Бяляцкі — усяго 50 паэтаў. **Пачатак а 12-й гадзіне на Гарошкаўскіх могілках, каля помніка паэту.** У 12.30 — урачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі на хаце паэта. А 13-й пачнуцца паэтычныя чытанні і бардаўскі канцэрт на падворку. Падчас свята адбудзецца прэзентацыя кнігі прысвячэнняў Анатолю Сысу «Ягамосць» і выбранага томіка паэзіі «Алаіза», а таксама нумара часопіса «Дзеяслоў», прысвечанага юбілею паэта. Даведкі праз т.: (025) 60-60-891 (у Мінску) і (033) 672-24-60 (у Рэчыцы). Свята адбудзецца пры падтрымцы кампаніі «Будзьма беларусамі!». З Мінска едзе мікрык. Лічба вольных месцаў у ім абмежаваная. Сваім ходам у Гарошкаў можна дабрацца праз Рэчыцу. Ад гэтага горада да вёскі Гарошкаў 8 км.

### 50-годдзе Сыса ў Мінску

У межах святкавання 50-годдзя паэта Анатоля Сыса (1959-2005) **у мінскім музеі Максіма Багдановіча да 31 кастрычніка** працуе выстава мастака Алеся Квяткоўскага «Мая хата без сяброў не хата», а таксама ягоная ж выстава «На крыле ў пчалінай маткі...» працуе ў гомельскай галерэі Гаўрылы Вашчанкі.

### «Музычныя зазімкі» ў Лідзе

Бардаўскі канцэрт «Музычныя зазімкі» адбудзецца **ў г.Лідзе 1 лістапада ў актавай зале музычнай школы (вул.Савецкая, 10)**. У канцэрце возьмуць удзел **Алесь Камоцкі, Таццяна Беланогая, Зміцер Казлоўскі**. **Пачатак а 17-й.** Уваход вольны.

### Teck2nation-TK2N™

**8 лістапада ў забаўляльным комплексе комплексе РОКСІ (г. Мінск)** пройдзе Другі нацыянальны электра-дэнс івэнт «Teck2nation-TK2N™». Большасці людзей гэтыя танцы знаёмыя як «тэктонік». На івэнце будуць прадстаўленыя намінацыі: лепшая каманда, лепшая двойка, лепшы сола-танцор.




### «Можна!» у Маскве

Другі фестываль актуальнай беларускай музыкі ў Маскве «Можна!» пачнецца **6 лістапада а 19-й у клубе IKRA (Масква, м. Курская, вул. Казакова, 8а)**. Бяруць удзел: **«Серебряная свадьба», Адыс Абеба, Сяргей Пукст** і **Pukstband, Петля Пристрастия, HarYаль, «Касіяпея», Rocker-Joker, Botanic Project, PortMone, Cherryvata**.

### «Ад неба на паўметра 2009»

Этна-фэст «Ад неба на паўметра 2009» пройдзе **5 лістапада ў ДК МАЗ**. На сцэне з'явяцца дзіцячы фальклорны ансамбль **«Святкі»**, ансамбль народнай музыкі і песні **«Мінскія Музыкі», Алег Хаменка, Guda, Rokash, Unia, Hohaband, Akana-NHS, «Гаротніца», Energy, Dzivasil, «Нагуаль», «Князь Мышкін»**.

### Вечар памяці расстраляных літаратараў

**У Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул М.Багдановіча, 15) 29 кастрычніка а 17-й** пачнецца вечар памяці, прысвечаны маладым беларускім літаратарам «Летуценнем прахаджу над краем і загіну, быццам летуценне». У рамках вечарыны адбудзецца прэзентацыя новага выдання «Беларускага кнігазбору» «Расстраляная літаратура». 29 кастрычніка 1937 года — адна з самых трагічных старонак ў гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя. Былі расстраляны Міхась Чарот, Васіль Сташэўскі, Міхась Зарэцкі, Анатоль Вольны, Платон Галавач, Васіль Каваль, Юрка Лявонны, Валерый Маракоў, Юлі Таўбін... Сярод гасцей вечарыны — даследчыкі, пісьменнікі, родныя.

### «Пластылінавы бусел»

Адзінаццаты літаратурны фестываль для паэтаў-пачаткоўцаў «Пластылінавы бусел» адбудзецца **31 кастрычніка ў Магілёве (МДУ імя А.Куляшова, корпус 4, актавая зала)**. **Пачатак у 16.30.** Уваход вольны.

### «Культурныя формы»

**6 лістапада ў бібліятэцы імя Цёткі (вул. Талбухіна, 12а)** — літаратурна-забаўляльная праграма найпрыгажэйшых дзяўчат-паэтак «Культурныя формы» з удзелам Юліі Новік, Вікі Трэнас, Ганны Федарук, Асі Паплаўскай, Таццяны Беланогай... **Пачатак у 18.30.** Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

### Millenium

**У Палацы мастацтва да 15 лістапада** працуе выстава «Millenium», прысвечаная 1000-годдзю першай згадкі ў пісьмовых крыніцах наймення Літва. Поруч з творамі беларускіх мастакоў розных пакаленняў асобны раздзел экспазіцыі складаюць творы дзяцей Беларусі і іншых дзяцей свету.

### Гараджанкі: жаночы погляд

**У Музеі гісторыі беларускага кіно (вул.Свярдлова, 4) да 5 лістапада** працуе выстава ручной вышыўкі «Гараджанкі: жаночы погляд».

### Апосталы Гервят

**У галерэі касцёла Св.Сымона і Св.Алены** працуе выстава Валерыя Вядрэнкі «Апосталы Гервят». Выстава з'яўляецца вынікам двухгадовай працы над матэрыялам фатаграфавання касцёла Св. Троіцы ў в.Гервяты Астравецкага р-на. Экспазіцыя складаецца з дзвюх частак. У першай аўтар знаёміць гледача з мясцовасцю, касцёлам і яго інтэр'ерам. Другая частка выставы прадстаўляе фотапластычную кампазіцыю на тэму вобразаў Евангелля.




### Кнігі часоў Боны Сфорцы

**У Нацыянальнай бібліятэцы (пр.Незалежнасці, 116)** працуе выстава «Італьянскія кнігі на беларускіх землях часоў Боны Сфорцы», прысвечаная старадрукам, выдадзеным у Італіі ў другой палове XV—XVI стст. На выставе можна ўбачыць першае ілюстраванае выданне «Боскай камедыі» Дантэ Аліг'еры, кнігі Петраркі і Макіявелі, якія самі аўтары, магчыма, трымалі ў руках.

## СПОРТ

### «Дынама» (Мінск) — ЦСКА (Масква)

Матч легендарных камандаў на Чэмпіянаце КХЛ. **30 кастрычніка, Палац спорту.**

## ТЭАТР

### Фестываль «Панарама»

**31 кастрычніка.** Закрые праграму спектакль «Арлекін — служка двух гаспадароў» міланскага тэатра Piccolo Teatro di Milano, якому сусветную вядомасць прынёс заснавальнік — слынны тэатральны рэжысёр і драматург Джорджа Стрэлер. Рэдкі прыклад праўдзівага тэатральнага чараўніцтва, спектакль «Арлекін», жыве сваім жыццём ад часоў стварэння тэатра, зазнаўшы шматлікія аднаўленні і мадыфікацыі. Да 1961 роль Арлекіна выконваў вялікі Марчэла Марэці, а пасля яго смерці ў 1963 — Феруча Салеры, чые дасціпныя і пластычна віртуозныя трукі ўвайшлі ва ўсе тэатральныя хрэстаматыі свету. **Пачатак а 12-й і 19-й.**

**3 лістапада**

**Тэатр імя Горкага** — «Нібыта хворы»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр оперы і балета** — «Травіята»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чайка»

**4 лістапада**

**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Тэатр оперы і балета** — «Карсар»

**5 лістапада**

**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»
**Тэатр імя Горкага** — «Я твая нявеста»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Музычны тэатр** — «Баядэра»
**Тэатр оперы і балета** — «Моцарт і Сальеры. Канцэрт»

**6 лістапада**

**Тэатр юнага гледача** — «Нататкі звар'яцелага музыкі»
**Тэатр оперы і балета** — «Пахіта». «Свет не сканчаецца ля дзвярэй дома». «Балеро».
**Музычны тэатр** — «Магія любові»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Карусель»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»

**8 лістапада**

**Тэатр імя Горкага** — «Каштанка»
**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Тэатр оперы і балета** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Музычны тэатр** — «Нябесны ціхаход»
**Тэатр імя Горкага** — «На залатым возеры»

## КІНААФІША

### Воблачна, магчымыя ападкі ў выглядзе фрыкадэлек

(Cloudy with a Chance of Meatballs) ЗША, 2009, каляровы, 90 хв.

**Рэжысёры:** Філ Лорд, Крыс Мілер

**Жанр:** Анімацыйная камедыя для ўсёй сям'і

**Адзнака:** 8 (з 10)




Раней навуковец Флінт Локвуд прыдумваў адны непрыемнасці. А цяпер ён вынайшаў машыну, якая ператварае ваду ў ежу. Над ягоным горадам ідзе дождж з гамбургераў і цукерак. Турысты штурмуюць кухарскі рай. Але абжорства да дабра не даводзіць. Фрыкадэльная машына шалее. Флінт разам з прыгажуняй Самантай змагаецца з макаронным штормам і сырнымі навальніцамі. Абжорству — бой!

Анімацыйная стужка Філа Лорда і Крыса Мілера — карнавальнае свята ежы. Тут вам і тарты ў твар, і шпурлянні гарбузамі. Жэлейныя палацы, марозіва і бекон — усё ў асартыменце.

Трыумф святла і колераў. Ах, каб гэта пабачыць у 3D...

**Андрэй Расінскі**

# Пакажы свой 3G!

Прэзентацыя 3G, тэхналогіі сувязі трэцяга пакалення, — істотная падзея для беларускага рынку мабільнай сувязі.







Самыя цікавыя магчымасці новай тэхналогіі — высокахуткасны інтэрнэт, відэасувязь і мабільнае тэлебачанне. У Беларусі пакуль толькі аператар мабільнай сувязі, Life:), атрымаў радыёчастотны спектр для стварэння 3G. Але ў кампаніі ўсяго 500 тысяч абанентаў.

Абаненты астатніх аператараў у чаканні дазволу ўладаў для іх кампаній. Працоўная група Дзяржаўнай камісіі па радыёчастотах пагадзілася з прапановай Міністэрства сувязі наконт выдзялення ліцэнзіі аператарам МТС і Velcom. Аднак для канчатковага рашэння падтрымкі Мінсувязі недастаткова. Ці атрымаюць аператары радыёчастоты, стане вядома ў канцы года.

Па інфармацыі Life:), новая сувязь будзе працаваць пакуль што ў Мінску і абласных гарадах. Максімальная тэставая хуткасць склала 11,57 Мбіт у секунду. У гарадскіх умовах яна будзе ніжэйшай, але для камфортнай працы павінна хапіць.

Цэны ў Life:) такія — 100 мегабайтаў перадаплачанага трафіка на месяц каштуюць 10 тысяч рублёў. За гігабайт трэба заплаціць 49 тысяч.

Калі параўнаць цэны на мабільны 3G-інтэрнэт з суседскімі, становіцца бачнай дарагавізна беларускай сувязі. Абаненты польскага Play плацяць 35 тысяч рублёў на нашы грошы за 2 гігабайты. Ва Украіне ліцэнзіі на паслугі 3G-інтэрнэт пакуль не атрымаў ніводны аператар мабільнай сувязі.

Далёка не кожны мабільнік падтрымлівае 3G, але такія тэлефоны не абавязкова з'яўляюцца прадметам раскошы. У мінскіх інтэрнэт-крамах цэны на іх пачынаюцца ад 85$ за BenQ-Siemens EF81. Samsung SGH-L170 трошкі даражэйшы — 95$. Б/у-слухаўку можна знайсці і танней. Напрыклад, той самы BenQ-Siemens EF81 каштуе 50$.

**Ягор Марціновіч**

# «Мэрсэдэсы» будуць самі спыняцца на чырвонае святло




Mercedes-Benz распрацоўвае сістэму Smart Stop, якая наладзіць сувязь паміж аўтамабілем і святлафорамі. Прызначэнне новай біздротавай сістэмы бяспекі — забяспечыць спыненне аўтамабіля на чырвонае святло, калі кіроўца чамусьці не націснуў на тармаз.

Як працуе сістэма? За 50 метраў да скрыжавання на спецыяльным экране з'яўляецца папярэджанне, што ўжо варта тармазіць. Пасля 40 метраў высвечваецца знак «Стоп». І нарэшце, за 30 метраў да скрыжавання на дысплеі з'яўляецца надпіс «Automatic Stop», уключаецца гукавы сігнал і аўтамабіль сам тармозіць.

Распрацоўшчыкі мяркуюць, што сістэма можа ўвайсці ў шырокі ўжытак ужо праз пяць гадоў.

**ЯМ**

# Сем рэцэптаў ад дэпрэсіі

На двары па-восеньску халодны дождж, дый душэўнае надвор'е не радуе. Усё часцей наведваюць сумныя думкі, і свет навокал падаецца непрыемным шэрым сном. Калі гэта падобна да вашага самаадчування, віншую: у вас восеньская дэпрэсія.

Дактары ставяцца да сезоннай дэпрэсіі пацыентаў з іроніяй: падумаеш, папіце антыдэпрэсантаў і пачакайце на вясну. Але ёсць яшчэ некалькі рэцэптаў, якія можна паспрабаваць без шкоды для здароўя.

### Рэцэпт першы: святло і колеры

Паклапаціцеся пра добрае асвятленне ў памяшканні, дзе вы працуеце. Святло будзе спрыяць добраму настрою і стымуляваць працаздольнасць. Не трэба эканоміць на здароўі вачэй і ўласным настроі. Лекі даражэйшыя за клавяты.

Яшчэ псіхолагі раяць правесці колератэрапію. Жоўценькія, чырвоненькія, памаранчавыя і іншыя яркія драбніцы павесяляць вас і нагадаюць пра лета і добры настрой.

### Рэцэпт другі: навінкі

Гэта не тое, што вы падумалі. Памяняйце сабе стрыжку або колер валасоў. Набудзьце новую адзежыну ці якую прыладу для аўтамабіля. Штосьці новае ў вашай выяве ці атачэнні зарадзіць вас пазітыўнай энергіяй. І ніводзін доктар не адмяняў шопінг як сродак барацьбы з дрэнным настроем. Карыстайцеся!

### Рэцэпт трэці: планаваць і марыць

Падумайце, як весела будзе зімой пакатацца на лыжах ці каньках, сплануйце Новы год і Каляды. Можна пачаць загадзя рыхтаваць падарункі, калі, канешне, фінансавы бок гэтай справы не выклікае ў вас адмоўных эмоцыяў. Калі любіце вязаць або шыць, паглядзіце часопісы мод, абярыце мадэль і... не забывайцеся на яркія і насычаныя колеры!

### Рэцэпт чацвёрты: падыміце пятую кропку з канапы

Займіцеся чымсьці новым (танцамі, аэробікай, плаваннем, фігурным катаннем). Спорт дапаможа застацца ў форме і зарадзіць вас выключна пазітыўнай энергіяй. Часцей сустракайцеся з сябрамі. Іншымі словамі, усяляк пазбягайце хаты восеньскімі вечарамі.



### Рэцэпт пяты: добрая кніга і прыемная музыка

Псіхолагі рэкамендуюць пачынаць раніцу з вясёлай энергічнай музыкі. А не з палітычных навінаў, тым больш крымінальнай хронікі. Яшчэ прафесар Прэабражэнскі не раіў, памятаеце? Як варыянт, вызваліць вечарам гадзінку для ўлюбёнай кнігі пад спакойную прыемную музыку з кубачкам смачнай гарбаты. Няўжо гэта не шчасце?

### Рэцэпт шосты: смакоцце

Каб пазбавіцца ад дэпрэсіі, ешце болей свежай садавіны і гародніны, піце болей сокаў. Калі вы любіце салодкае, забудзьцеся пра дыеты на некаторы час, парадуйце сябе смачнай ежай. Але асцярожна: сезонная дэпрэсія можа змяніцца дэпрэсіяй ад лішніх кілаграмаў.

Не забывайце пра прыродныя стымулятары: травяныя гарбаты, кітайскі лімоннік, адвар шыпшыны. З раніцы дазваляйце сабе кавалачак чорнага шакаладу. Горкі шакалад узмацняе выпрацоўку серататніна, гармона радасці, а значыць, паляпшае настрой! Гармоны шчасця «здабыць» можна таксама ўжываючы марожанае, бананы і цукаты.

### Рэцэпт сёмы: найлепшы

Пастаўце сабе за мэту хваліць сябе за кожную зробленую справу. Прачнуўся а сёмай — малайчына, зрабіў 10 адціскання — асілак, спазніўся на працу — таксама добра, не атрымалася справа — знаць, атрымаецца іншая.

Што б з вамі ні здаралася, заставайцеся пазітыўнымі, і тады нават самае змрочнае і халоднае надвор'е падасца вам прыемным восеньскім дзянёчкам.

**Настасся Шамрэй**

# У валасатых свае праблемы

Самы валасаты чалавек у свеце звярнуўся да пластычных хірургаў. Хоча стаць прыгожым, каб… сыграць у кіно малпу.



Праз гарманальны дысбаланс валасы пакрываюць 96% цела 32-гадовага кітайца Ю Чжнхуаня. Нядаўна ён паспрабаваў атрымаць ролю цара малпаў Сунь Укуна ў новай тэлеверсіі класічнага кітайскага рамана «Падарожжа на Захад». Аднак рэжысёр фільма заявіў, што прэтэндэнт недастаткова прыгожы.

«Я маю намер легчы на аперацыю, зрабіць пластыку твару, каб быць больш падобным да сімпатычнай малпы. Няхай рэжысёр пашкадуе аб сваім рашэнні», — кажа Ю Чжэнхуань. На думку пластычнага хірурга, давядзецца ладна папрацаваць з вачыма, носам і вушамі акцёра. Чжэнхуань, якога Кніга рэкордаў Гінэса ў 2002 годзе прызнала самым валасатымі чалавекам у свеце, ужо пазбаўляўся ад часткі валасоў, каб не пакутаваць ад гарачыні летам, лепш бачыць і чуць.

У асабістым жыцці залішнія валасы не перашкаджаюць, кажа мужчына. З каханай у яго ўсё ў парадку: «Мы выдатна ладзім. Валасы для яе не граюць ніякай ролі».

**ЗП**

## НАША СТРАВА

### Шчупак, запечаны з хрэнам

Шчупак на 1,5—2 кг, соль, 2 цыбулі, 1,5 лыжкі масла, 1,5 шклянкі хрэну, 1—1,5 шклянкі смятаны.

Шчупака вымыць, вычысціць, пасаліць, парэзаць на кавалкі. Цыбулю здрабніць, адціснуць сок, падсмажыць на масле, дадаць хрэну, перамяшаць і яшчэ троху пасмажыць.

Кавалкі рыбы выкласці на невялікую глыбокую бляху, кожны рад рыбы перасллойваючы сумессю цыбулі і хрэну. Заліць зверху смятанай, закрыць покрыўкай і запякаць да гатоўнасці ў печы або духоўцы.

### Калдункі па-тышкевіцку

140 г сушаных грыбоў, 2 цыбулі, 2—3 лыжкі масла, 200 г тлустай шынкі, 2 яйкі, соль, перац. Для цеста: 2 шклянкі мукі, 2 яйкі, соль.

Добра вымыць сухія грыбы і адварыць іх да гатоўнасці, здрабніць. Цыбулю дробна нарэзаць, адціснуць сок, падсмажыць на масле, змяшаць з грыбамі. Дадаць у фарш здрабнёную як мага мяльчэй шынку.

З указаных інгрыдыентаў прыгатаваць цеста, падзяліць на 2 часткі, раскатаць тонкім слоем кожную частку. На адзін ліст цеста на невялікай адлегласці адна ад адной раскласці купкі фаршу, накрыць другім лістом цеста. Невялікай шклянкай ці формачкай выціснуць калдункі. Адварыць іх у кіпені, гатовыя калдункі паліць растопленым маслам з добра падрумяненай цыбуляй.

З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская»

**Рэцэпты тыдня падрыхтавала і праверыла — пальчыкі аблізала — Наталка Бабіна**

## ГАЗЕТКА ДЗЕТКАМ

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

У мяне зубная шчотка.
Ёю зубы чысціць чотка.
Хто не чысціць зубы шчоткай,
Вырасце бяззубай цёткай!

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КВАТЭРА

**Сям'я свядомых беларусаў** сталага веку здыме 1—2-пакаёвую кватэру ў Савецкім ці Першамайскім раёне. Т.: (029) 110-87-66

### КНІГІ

**Беларускія кнігі:** гісторыя, этнаграфія, фальклор, культуралогія, авангард, постмадэрнізм, медыявістыка, архітэктура, краязнаўства. Т.: (029) 753-91-96, alesknihi@mail.ru

### ПАДАРОЖЖА

**Антон Астаповіч запрашае** ў сяброўскае падарожжа 22 лістапада па маршруце: Мінск—Рубяжэвічы—Сула—Куль—Хатава—Налібакі—Дзераўное—Стоўбцы—Мінск. Т.: (029) 111-73-32, (017) 262-73-43

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!



Ледзяны дождж, як летні душ. Фаны БАТЭ падурэлі ад шчасця. 22 кастрычніка барысаўскі клуб першы раз перамог у Лізе Еўропы. БАТЭ—АЕК (Афіны) 2:1.



Мінскі трактарны завод прэзентаваў новы супертрактар «Беларус-3023». Ён не мае аналагаў у свеце. У наступным годзе выйдзе 20 такіх машын для вывучэння попыту. Папярэдняя мадэль МТЗ «Беларус-2022» каштавала 146 тысяч даляраў за адну машыну. «Беларус-3023» абсталяваны электрамеханічнай трансмісіяй, якая дазваляе бесступенева рэгуляваць хуткасць руху. Гэта дае 15-працэнтавую эканомію паліва. А пры патрэбе такі трактар можа падтрымліваць забеспячэнне электрычнасцю цэлай фермы, з усёй яе электронікай і агрэгатамі. Вось такія крутыя штукі вырабляе Беларусь!



Юлію Цімашэнку вылучылі кандыдатам у прэзідэнты Украіны. Цырымонія адбылася 24 кастрычніка на пампезным з’ездзе партыі «Бацькаўшчына», што прайшоў на галоўнай плошчы Кіева. Цімашэнка была апранутая ў нацыянальную вышыванку. З’езд суправаджаўся феерверкам і канцэртам кшталту тых, якія ў нас называюцца «За Беларусь». Цімашэнку па-ранейшаму падтрымлівае цэнтр і захад краіны, Януковіч абапіраецца на ўсход.



Ва Унутраных войсках МУС Беларусі прайшлі кваліфікацыйныя выпрабаванні на права нашэння крапавага берэта. Ён лічыцца сімвалам мужнасці, гонару і годнасці ваеннаслужачых УВ.

Фэст «Рок па вакацыях» прайшоў у клубе «Рэактар».









## АНЕКДОТЫ

Сям’я перад абедам.
Маці: Сынок, ты што на абед хочаш?
Сын: Мне тое ж, што і тату.
Маці: Час табе ўжо сваё меркаванне мець, што ты ўсё на іншых глядзіш.
Сын: Ну, мне тады тое ж, што і табе.
Маці: Вось малайчына.

* * *

Варажбітка кажа наведвальніцы:
— У бліжэйшы час вас чакае вялікая страта. Магчыма, гэта будзе ваш муж.
— Я ўжо 2 гады ўдава.
— Тады — парасон.

* * *

У Беларусі ёсць будучыня! Бачыце — ужо і мінулае патроху паяўляецца.

* * *

Абвестка.
«Мне ўвесь час даводзіцца спаць з жанчынамі. Яны ўжо мяне задзяўблі. Хачу у хімчыстку».
Подпіс: «Плюшавы мішка».

* * *

Дачка тэлефануе бацьку:
— Татусік! Можаш мяне павіншаваць, я замуж выйшла!
— Нічога не ведаю! Як завечарэе — адразу дахаты!

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Мінск.** Судзебная палата разглядала справу трох чалавек, іх вінаватымі ў належнасці да Беларускай сацыялістычнай грамады. Судзілі: бібліятэкара гарадской бібліятэкі Віктара Зелязея, яго памочніцу Маршак і Зыгмунта Зелязея. У кватэры Віктара і Зыгмунта Зелязееў ў часе вобыску знайшлі кніжкі і пракламацыі, выдадзеныя Грамадой, і ліставанне. Палата засудзіла Віктара Зелязея ў ссылку на пасяленне і Зыгмунта Зелязея на 1 год крэпасці, а Маршак — апраўдала.

**«НН». №44. 1909**

Савецкі чалавек любіў і любіць тое, што вялікае і шырокае, яго насцярожвае ўсё дробнае і малагабарытнае. Для невялікіх тэрыторыяў накшталт Беларусі гэткі некрытычна засвоены імперскі комплекс крые ў сабе пагрозу несувымернасці. Несувымернасць паміж прэтэнзіяй на гранічную мудрасць і святасць улады і рэальнай мерай распусты сярод вярхоў, паміж ілюзіяй вяршэнства закону і паўсюдным і паўсядзённым яго патаптаннем, нарэшце, паміж гучнымі пампезнымі фразамі і мізэрнымі нікчэмнымі справамі.

**Валер Булгакаў, «НН». №29. 1999**

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6150. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 27.10.2009.
Замова № 5914.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12